ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● кошт 3000 рублёў

15 мая 1998 г., пятніца, № 102 (23453)



ЭНЕРГЕТЫЧНЫ КРЫЗІС БЕЛАРУСІ НЕ ПАГРАЖАЕ

Прэс-канферэнцыя, прысвечаная праблемам забеспячэння нашай рэспублікі энерганосьбітамі, прайшла ў Нацыянальным прэс-цэнтры.

Кіраўнікі канцэрнаў «Белэнерга» і «Белпаліўгаз», якія выступілі перад журналістамі, канстатавалі, што мінулы ацяпляльны сезон прайшоў для рэспублікі без сур'ёзных праблем, і хаця ў сакавіку-красавіку гэтага года абмяжаванні на пастаўку ў нашу краіну газу з Расіі дасягалі 30 працэнтаў, радавы спажывец [illegible] дзякуючы выкарыстанню галіной замест газу кацельна-печнага паліва і топачнага мазуту. [illegible] Менавіта таму сёлета, у якасці стратэгіі, вадкага паліва будзе назапашвацца на зіму больш, чым звычайна.

Усяго ж, пры самым найлепшым раскладзе, патрэбнасці Беларусі ў прыродным газе складаюць на сённяшні дзень 16,5 млрд. куб. м пры выдзеленай РАТ «Газпрам» квоце ў 15 млрд. куб. м. Таму, натуральна, на самым пытанне забеспячэння краіны газам у другім і трэцім квартале сёлетняга года (безумоўна, пры зусім нармальных узаемаадносінах з расійскім бокам) можна лічыць практычна закрытым. Што датычыцца чацвёртага квартала, то, па словах прэзідэнта Беларускага канцэрна па паліву і газіфікацыі «Белпаліўгаз» Эдуарда Тоўпенца, ужо дасягнуты дамоўленасці з міжнароднай энергетычнай карпарацыяй «Итэра» на пастаўку ў нашу краіну (у якасці дадатковых рэсурсаў) газу ў аб'ёме да 1 млрд. куб. м і з РАТ «Газпрам» — звыш 500 млн. куб. м прыроднага газу.

Стабільнасць назіраецца зараз і з пастаўкамі ў нашу краіну звадкаванага газу: 20-дзённы яго запас дазваляе сцвярджаць, што [illegible]

Не выклікае пакуль хвалявання і забеспячэнне насельніцтва брыкетам: пры патрабаванні рэспублікі ў 1,5 млн. тон брыкету ў год, 0,5 млн. тон брыкету ўжо было выраблена за 4 месяцы гэтага года. [illegible]

Надзея НІКАЛАЕВА.

БЕЛАРУСЬ Б'Е ЦУКРОВЫЯ РЭКОРДЫ

Як стала вядома карэспандэнту «Звязды» з кампетэнтных крыніц, Саветам Міністраў краіны прынята рашэнне аб выдзяленні сродкаў на закупку цукру (гатовай прадукцыі) у колькасці 50 тысяч тон. Кантракты былі падпісаны на мінулым тыдні, і літаральна праз дзень-два ў Беларусь паступяць першыя 20 тысяч тон белага цукру.

Гатовы цукар быў закуплены [illegible] Дарэчы, [illegible] закупае таксама вялікая партыя і сырцу. Не сакрэт, што попыт на цукар у краіне не змяншаецца. Калі летась у гэты перыяд штодзень па рэспубліцы рэалізоўвалася ў сярэднім каля 300 тон салодкай прадукцыі, дык зараз рэалізацыя цукру дасягае 500(!) тон штодзень. Відаць, сёлета ў Беларусі будуць пабіты ўсе магчымыя і немагчымыя рэкорды рэалізацыі гэтага прадукту харчавання. Хаця асаблівых праблем з цукрам зараз няма. [illegible] Не дзіўна — ніхто ў афіцыйных і неафіцыйных размовах не можа патлумачыць, чым выкліканы такі павышаны попыт на цукар.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КРЫМІНАЛ

ВОСЬ І ВЕР ПАСЛЯ ГЭТАГА ЛЮДЗЯМ

Пракуратурай Мінска накіравана ў суд крымінальная справа, расследаваная следчым упраўленнем ГУУС Мінгарвыканкама, у адносінах да прадстаўніка аднаго з рэспубліканскіх дабрачынных фондаў.

Гэтая асоба прадстаўлялася дырэктарам кааператыва «Абіко» і ў перыяд 1994—1997 гг. шляхам падману, злоўжывання даверам заключыла фіктыўныя дагаворы купілі-продажу, учыніла крадзеж чатырох аўтамабіляў і тым самым прычыніла матэрыяльную шкоду на суму больш за 1,5 млрд. рублёў. [illegible]

Аляксей ТАРАНАЎ.

СПРЫТНЫ ІНВАЛІД І ДАВЕРЛІВЫ СПАРТСМЕН

Пасля ўдзелу ў спаборніцтвах па класічнай барацьбе, якія прайшлі ў Мінску, [illegible] член зборнай Расіі, жыхар Краснадара В.

Спартсмен спыніўся ў гасцініцы «Гарызонт», а ўвечары пайшоў адпачыць у бар «Адмірал». Тут за чаркай ён і пазнаёміўся з жыхаром латвійскага горада Лепая. А потым запрасіў новага знаёмага да сябе ў нумар. А раніцай спартсмен убачыў, што зніклі яго вопратка і абутак [illegible] на агульную суму 36 мільёнаў рублёў. [illegible]

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

НАДЗЁННАЕ

ПРАКУРАТУРА ВЫКАНАЛА РАБОТУ НАД МЫТНЫМІ ПАМЫЛКАМІ

Нягледзячы на тое, што Беларусь фактычна не мае ўласных прадпрыемстваў па масавай вытворчасці легкавых аўтамабіляў (СП «Форд-Юніён» пакуль яшчэ перажывае стадыю станаўлення і не прыступіла да масавага выпуску легкавікоў), [illegible] Праўда, для таго, каб сярэднестатыстычны беларус усё ж змог набыць недарагую патрыманую іншамарку, у нашай краіне для грамадзян рэспублікі былі ўведзены пэўныя льготныя тарыфы пры мытным афармленні аўтамабіляў замежнай вытворчасці. [illegible]

Вядома ж, пры існаванні падобных, як і любых іншых, льгот з'яўляецца спакуса незаконна імі скарыстацца. Што і адбывалася ў нашай краіне апошнім часам, пакуль на гэту праблему не звярнула пільную ўвагу пракуратура. [illegible]

А своеасаблівы вынік гэтай работы быў падведзены [illegible] калегіі [illegible] Міхаіл СНЯГІР адзначыў, што праблема [illegible] зараз надзвычай актуальная не толькі для дзяржавы, але і для кожнага асобнага яе грамадзяніна.

СТРАЧАНЫЯ МІЛЬЯРДЫ

Яшчэ ў мінулым годзе пракуратура звярнула ўвагу на факты незаконнага вызвалення ад уплаты мытных плацяжоў грамадзян, якія нібыта працавалі за мяжой. У выніку было ўзбуджана 159 крымінальных спраў, а ў суды прад'яўлены іскі аб спагнанні з «ілжэ-арбайтэраў» у даход дзяржавы каля 10 мільярдаў рублёў.

Зрэшты, у мінулым годзе падобная льгота па ініцыятыве пракуратуры была наогул адменена. Аднак прымусіць усіх імпарцёраў замежных транспартных сродкаў плаціць мытныя пошліны ў скарбонку беларускай дзяржавы яшчэ не ўдалося. Як адзначалася на калегіі, мытныя органы пакуль не наладзілі стройнай сістэмы камп'ютэрнага ўліку ўвозімых у Беларусь транспартных сродкаў, таму тысячы іншамарак зніклі ў невядомым накірунку, а значыць дзяржава не атрымлівала мільярды рублёў у выглядзе пошлін. Так, напрыклад, у 1996 годзе не было прадстаўлена для мытнага афармлення 7,5 тысяч увезеных у Беларусь іншамарак, а ў 1997 годзе — 11 тысяч аўтамабіляў. Калі ўлічыць, што нават па льготным тарыфе «растаможванне» аднаго аўтамабіля каштуе ў сярэднім 300—600 долараў, то няцяжка падлічыць, якія грошы праплылі міма дзяржаўнага бюджэту нашай краіны. Між іншым, да гэтага часу невядома куды зніклі гэтыя 18,5 тысячы аўтамабіляў. Можна толькі здагадвацца, што пэўная колькасць была разабрана на запчасткі, некаторыя эксплуатуюцца па фіктыўных дакументах, некаторыя вывезены ў Расію.

Дарэчы, варта адзначыць, што ўмовы для падобных правапарушэнняў былі закладзены ў самім дзеючым заканадаўстве. Толькі адносна нядаўна была ўведзена практыка фінансавых гарантый уплаты мытных плацяжоў, калі грошы за «растаможку» можна ўнесці ў мытныя органы па месцы жыхарства перад паездкай за аўтамабілем, альбо непасрэдна на мяжы пры вяртанні дамоў.

А што датычыць вызвалення ад мытных плацяжоў грамадзян, якія працавалі за мяжой, то імёны ініцы[illegible] 35 мільярдаў рублёў.

ПРЫВАТНЫЯ ТАКСІСТЫ ТРАПІЛІ Ў ПАСТКУ

Так ужо атрымалася, што масавы ўвоз іншамарак выклікаў узнікненне з'явы, [illegible] на якіх на аўтамабілях, «растаможаных» па льготнаму тарыфу. Толькі ў Мінску такіх таксістаў больш за тысячу. Паводле заканадаўства, выкарыстоўваць такі аўтамабіль у камерцыйных ці якіх-небудзь іншых, не асабістых мэтах, забаронена. Але ж гэтыя прыватныя таксісты маюць выдадзеныя выканаўчымі камітэтамі ліцэнзіі. Пракуроры, кіруючыся літарай закона, вядома ж, могуць, не зважаючы на наяўнасць ліцэнзіі, абавязаць прыватнага таксіста альбо заплаціць мытную пошліну з разліку 5 ЭКЮ за 1 куб.см аб'ёму рухавіка аўтамабіля, альбо ўвогуле праз суд канфіскаваць транспартны сродак.

Што датычыць першага варыянта пакарання, то наўрад ці прыватныя таксісты ў стане выплаціць за «растаможванне» па некалькі тысяч долараў.

Другі варыянт пакарання — канфіскацыя аўтамабіляў праз суд ужо спрабуюць прымяніць пракуроры ў некаторых абласцях Беларусі. З пункту гледжання заканадаўства, магчыма, гэтая мера і справядлівая. Аднак наўрад ці гэта прымальны варыянт барацьбы з нязлоснымі парушальнікамі заканадаўства.

Па-першае, наўрад ці дзяржава істотна разбагацее ад канфіскаваных старых іншамарак.

Па-другое, як слушна заўважыў пракурор Мінска Мікалай Купрыянаў, пазбавіўшы прыватных таксістаў магчымасці працаваць легальна, дзяржава загоніць іх у падполле.

Словам, гэтая праблема патрабуе ўзважанага падыходу з боку заканадаўчых і выканаўчых структур краіны, якія павінны ўнесці неабходныя змены ў нарматыўна-прававыя акты.

Дарэчы, выступіўшы на калегіі першы намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Аляксандр Дзеравяшка адзначыў, што адпаведны праект пастановы мытнікамі ўжо ўнесены на разгляд Савета Міністраў.

Аляксандр Мікалаевіч таксама запэўніў, што ўсе выказаныя на калегіі крытычныя заўвагі ў адрас мытні прыняты да ведама і кіраўніцтва камітэта зробіць усё магчымае для выпраўлення памылак і недахопаў у рабоце мытных органаў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.



ЛЯЛЬКА — РЭЧ СУР'ЁЗНАЯ

Сем гадоў існуе ў дзіцяча-юнацкім цэнтры Фрунзенскага раёна Мінска гурток «Майстрыха». Не злічыць, колькі за гэты час створана тут вясёлых, прыгожых лялек па матывах народных казак або паводле персанажаў сучасных мультфільмаў. Гэтыя лялькі дзятва па-майстэрску шые з кавалачкаў рознакаляровай тканіны, аздабляе аплікацыяй, расфарбоўвае. Шмат разоў творчасць школьнікаў высока адзначалася журы буйных выставак і конкурсаў.

Але выраб такіх забаўляльных цацак з'яўляецца не толькі практыкаваннем у кравецкім майстэрстве: гурткоўцы рыхтуюць падарункі для дзяцей-інвалідаў, перадаюць іх у гарадскі Дом немаўляці. Акрамя гэтага продаж такіх цацак дазваляе зарабляць дадатковыя сродкі на існаванне гуртка.

У гэтыя дні выставачная зала дзіцяча-юнацкага цэнтра аддадзена пад экспазіцыю, падрыхтаваную гуртком «Майстрыха». Прыходзьце, глядзіце, здзіўляйцеся!

***На здымках:** самая маленькая лялька лёгка размяшчаецца на дзіцячай далоні; кіраўнік гуртка Алена Дацюк з юнымі майстрамі і новымі лялькамі.*

Яўген ПЯСЕЦКІ.

У МЯСЦОВЫХ ОРГАНАХ УЛАДЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ПРАДСТАЎЛЕНЫ ДАСТОЙНЫЯ ЛЮДЗІ

Пытанні якаснага паляпшэння нарматыўных актаў, што рэгламентуюць выбары ў мясцовыя органы ўлады і правядзенне агульнанацыянальных рэферэндумаў, былі разгледжаны ў ходзе нарады па абмеркаванню канцэпцыі рэформы выбарчай сістэмы Беларусі і метадаў яе рэалізацыі. Яна адбылася 14 мая пад старшынствам Аляксандра Лукашэнкі ў рэзідэнцыі кіраўніка беларускай дзяржавы. На ёй прысутнічалі прэм'ер-міністр Сяргей Лінг, кіраўнікі абедзвюх палат парламента Анатоль Малафееў і Павел Шыпук, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Міхаіл Мясніковіч, сакратар Савета бяспекі Віктар Шэйман, кіраўнікі шэрагу міністэрстваў і ведамстваў.

«Выбары мясцовых органаў улады, якія адбудуцца ў нашай краіне ў 1999 годзе, павінны прайсці па змененых законах, у строгай адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь». Такую думку ў ходзе нарады выказаў прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы назваў тры асноўныя прынцыпы, якія павінны быць закладзены ў новы закон аб выбарах у мясцовыя саветы. Па-першае, галасаванне павінна праходзіць строга па мажарытарнай сістэме. «Вопыт нашых бліжэйшых суседзяў, і перш за ўсё Расіі, пераканаўча даказаў неэфектыўнасць выбараў па партыйных спісах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Павінен быць захаваны, на думку прэзідэнта, і 50-працэнтны рубеж яўкі выбаршчыкаў на ўчасткі для прызнання таго, што выбары адбыліся. Пры гэтым за кандыдата ў дэпутаты павінна прагаласаваць таксама больш чым палова тых, хто прымаў удзел у выбарах. «Толькі ў гэтым выпадку дэпутацкі мандат можна лічыць легітымным», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі таксама асабліва падкрэсліў неабходнасць унясення ў заканадаўства нормы, якая перашкаджала б вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты, якія калі-небудзь прыцягваліся да судовай адказнасці. «У заканадаўчых органах павінны быць прадстаўлены людзі дастойныя, якія не заплямілі сваёй рэпутацыі», — заявіў прэзідэнт Беларусі.

БЕЛТА.

СЁННЯ — ДЗЕНЬ СЯМ'І

15 мая ў нашай дзяржаве святкуецца як Міжнародны дзень сям'і. Сёння асацыяцыя мнагадзетных бацькоў краіны будзе віншаваць у Мінску мнагадзетных маці, якім споўнілася 50 гадоў, з выхадам на пенсію. Заўтра сямейнае свята будзе прадоўжана (ужо для дзяцей) у парку Чэлюскінцаў канцэртамі, дыскатэкамі і атракцыёнамі. У аўторак, 19 мая, у тэатры музкамедыі адбудзецца заключнае мерапрыемства. На ім, у прыватнасці, мнагадзетныя мамы, якія маюць пяцёра і болей дзяцей, атрымаюць ордэны Маці, а напрыканцы для іх адбудзецца вялікі святочны канцэрт беларуска-расійскай эстрады.

У той жа час, згодна з данымі Міністэрства сацыяльнай абароны насельніцтва, у нашай краіне больш як 7 працэнтаў сем'яў пастаянна знаходзяцца за рысай беднасці, а 40 працэнтаў сем'яў жывуць у такім стане па 3-4 месяцы ў год.

Сям'я як ячэйка грамадства сёння перажывае сапраўдны крызіс. Зараз у краіне налічваецца 5767 сацыяльных сірот, сярод якіх ад 425 дзяцей маці адмовіліся яшчэ ў радзільным доме. Беларускі саюз жанчын б'е трывогу і заклікае ўсіх грамадзян краіны змагацца за сям'ю, супраць алкагалізму, наркаманіі і абыякавасці.

Сяргей КУРКАЧ.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

ЖОНКІ ВЕРТАЛЁТЧЫКАЎ-ЗАЛОЖНІКАЎ: МЫ СПАДЗЯЁМСЯ...

У адным з мінулых нумароў «Звязда» ўжо паведамляла аб трагічным лёсе экіпажа беларускіх верталётчыкаў, якія апынуліся ў ролі заложнікаў у заходнеафрыканскай краіне Сьера-Леоне пасля ўчыненага там путчу. Нягледзячы на ўсе намаганні беларускага Міністэрства замежных спраў, а таксама найперш МЗС Расійскай Федэрацыі (Беларусь не мае сваіх консульскіх упраўленняў у Заходняй Афрыцы, і пошукі вядуцца праз расіян, у якіх у гэтай краіне таксама прапалі без вестак тры экіпажы), за прайшоўшы даволі працяглы час, на жаль, нічога канкрэтнага аб людзях гэтым ведамствам высветліць не ўдалося. «Звязду» таксама хвалюе лёс нашых суайчыннікаў, якія трапілі ў бяду, не пакідае раўнадушным і лёс іх блізкіх, таму рэдакцыя паспрабавала правесці самастойнае расследаванне акалічнасцяў гэтай справы.

Як ужо паведамлялася, беларускі экіпаж верталётчыкаў складаюць чатыры чалавекі: Васіль Кулькоў, Іван Мартыновіч (а не Марціновіч, як указалі расіяне), Уладзімір Чэпель і камандзір Аляксандр Сапожнікаў. «Звяздзе» ўдалося адшукаць адрасы і пагаварыць з жонкамі траіх з іх.

Таццяна Вадзімаўна Сапожнікава зараз часова пражывае з хворай маці ў Яраслаўлі (у гутарцы з карэспандэнтам газеты апошняя заўважыла, што «самастойна нават хлеба не можа сабе адрэзаць»). Туды ж з Мінска пераехалі і дзве дачкі 14 і 21 года. Малодшая вучыцца ў восьмым класе сярэдняй школы, старэйшая — на 4-м курсе медінстытута. Тут жа ў Яраслаўлі пражывае і маці Аляксандра Сапожнікава, якая да апошняга нічога не ведала пра бяду з сынам. Сама Таццяна зараз не працуе, даглядае маці (абвастрэнне хваробы ў якой адбылося якраз пасля трагічных звестак аб зяцю), дачок, зрэдку ездзіць працаваць на дачу, даглядаць агарод. «Ад безвыходнасці, адчаю, адсутнасці вестак ад мужа, бывае, падкоціць нешта... Узнікала жаданне ўзяць дзяцей, паехаць у Маскву і аб'явіць галадоўку», — кажа яна. Апошні раз яна звярталася ў Дзярждэпартамент консульскай службы МЗС Расійскай Федэрацыі 6 мая, але нічога новага не пачула. Гаворачы гэта, жанчына пачынае хвалявацца, і я, каб змяніць тэму, прашу расказаць пра сябе і мужа.

«У шлюбе мы ўжо 23 гады, знаёмыя са школы, з Яраслаўля. Муж пайшоў на пенсію чатыры гады таму. Апошняе месца службы — лётчык-інструктар у штабе Ваенна-паветраных Сіл Беларусі. Да гэтага быў у Казахстане, Узбекістане, Чэхаславакіі, ва Украіне. Ваяваў у Афганістане, за што мае два ордэны Баявога Чырвонага Сцяга. У Мінску ў нас свая кватэра, мы і зараз там прапісаны».

Што падштурхнула да замежнага кантракта? Вядома, матэрыяльны бок, жаданне забяспечыць сям'ю. Мужык у 40 гадоў на пенсіі, двое дзяцей. «Аляксандр — чалавек сваёй справы. Ён можа лятаць, а не гандляваць, падманваць і ашукваць людзей», — гаворыць Таццяна. Кантракт заключыў з кампаніяй «Трансавіяэкспарт», папярэдне прайшоў перападрыхтоўку, каб лятаць на верталётах, курсы англійскай мовы. «Я прылятала да яго некалькі разоў. Джунглі, дарог няма, яны перавозілі людзей, грузы. Неяк у школы дастаўлялі кантрольныя работы». Путч адбыўся 25 мая 1997 года. На наступны дзень амерыканцы эвакуіравалі ўсіх іншаземцаў. Таццяна змагла вырвацца са Сьера-Леоне толькі 6 чэрвеня. Да гэтага лятала разам з Аляксандрам. «Што перавозілі — не ведаю, нас у грузавы адсек не пускалі. Адзінае, што муж мог сказаць — паведаміць аб перагрузцы верталёта». Жонку Аляксандр вывозіў з краіны асабіста. Але ў заложніках на зямлі засталіся таварышы — напрыклад, другім пілотам лятаў негр...»

Таццяна Сапожнікава напісала ліст асабіста Ельцыну, збіраецца таксама трапіць да яго на прыём. Звярнулася да генерала Громава, які ваяваў у Афганістане. Да пошукаў падключыліся губернатар Яраслаўля, знешняя разведка, Міжнародны Чырвоны Крыж. Спадзяецца яна і на вернутага да ўлады прэзідэнта Сьера-Леоне. «Я буду шукаць мужа столькі, колькі трэба. Я спадзяюся...»

Зоя Міхайлаўна Кулькова жыве ў Пружанах Брэсцкай вобласці. Яе муж паляцеў у Сьера-Леоне 25 чэрвеня 1995 года. Спярша кантракт быў на паўгода, але ўжо на месцы ўлады прапанавалі падоўжыць яго і муж збіраўся вярнуцца праз год. Такая прапанова прагучала нібыта з-за таго, што папярэднія спецыялісты, якіх накіроўвала сюды кампанія (Зоя Міхайлаўна назвала «Авіятэхнасервіс» — так ёй сказалі таварышы мужа, якія мелі з ёй справу), не задавальнялі ўлады. Васіль Кулькоў прыязджаў дамоў у адпачынак на тры месяцы — 12 лістапада 1996 года прыляцеў, 15 лютага 1997 года вярнуўся... Апошні раз тэлефанаваў дадому недзе 8-9 лютага гэтага года, абяцаў, што скора яны вернуцца на радзіму — чакалася наступленне міратворчых сіл. Праўда, да гэтага Зоя Міхайлаўна даведалася ад жонкі Мартыновіча, што ўсе іх размовы там праслухоўваюцца...

Дома ў Васіля Кулькова двое сыноў. Малодшаму — 18, старэйшаму — 23. Сам ён прафесійны вайсковец, борттэхнік па абслугоўванню верталётаў, яго таксама ў свой час пакідала па розных гарнізонах. Перад адпраўкай у Сьера-Леоне ніякай перападрыхтоўкі не праходзіў, зрабіў толькі прышчэпкі. Яшчэ Зоя Міхайлаўна патлумачыла, што трымала, у прыватнасці, мужа, у Сьера-Леоне: ім пастаянна затрымлівалі грошы. Як і іншым, ёй паведамілі, што ў спісах тых, хто трапіў у турму, яе мужа няма.

Іван Мартыновіч паехаў у Сьера-Леоне недзе 25—27 чэрвеня 1995 года. Інжынер-механік, ён тры гады быў у Афганістане, апошнім месцам службы было Гродна. Арміі аддаў 20 гадоў. На пенсію пайшоў каля шасці гадоў таму. У адпачынак Іван Мартыновіч прыехаў праз шэсць месяцаў. Прыехаў хворы, два тыдні праляжаў у ложку. Па словах жонкі Антаніны Аляксандраўны, якая жыве ў Слоніме, кампанія «Трансавіяэкспарт» не хацела пускаць яго назад — быў званок з Мінска. Але муж вярнуўся, бо яму не выплацілі грошы за шэсць месяцаў. У адпачынку ён быў 10 дзён, паехаў назад 1 лютага 1996 года, а 31 студзеня, па словах Антаніны Аляксандраўны, ездзіў у Мінск, у кампанію. Пасля яго ад'езду адтуль званілі, пагражалі, каб, калі вернецца, аддаў грошы.

Як расказваў ёй муж, у Сьера-Леоне яны вазілі або прэзідэнта краіны, або нейкія грузы. Яна павінна была ляцець да яго разам з Сапожнікавай ў студзені — муж прасіў яшчэ летам. Яна называла яму нумар свайго замежнага пашпарта, бо ён сказаў, што звяжацца з пасольствам Сьера-Леоне ў Расіі і ёй адкрыюць візу. Але візу Антаніне Аляксандраўне не адкрылі. Неўзабаве пасля перавароту Іван Мартыновіч сказаў жонцы па тэлефоне, што быў паранены ў руку...

Жанчыны зрэдку перазвоньваюцца паміж сабой, але пакуль у адказ мусяць гаварыць адна адной толькі тое, што пакуль нічога невядома. Як ужо паведамлялася, кампанія «Трансавіяэкспарт» катэгарычна адмаўляе свой удзел у заключэнні кантрактаў з верталётчыкамі на іх працу ў Сьера-Леоне. Але «Звязда» пакуль таксама выклала не ўсю вядомую ёй інфармацыю па гэтай справе. На жаль, нічога дакладнага не ўдалося высветліць пра чацвёртага члена беларускага экіпажа — Уладзіміра Чэпеля. Спадзяёмся, у будучым мы зможам праліць святло на лёс і гэтага чалавека.

Сяргей РАСОЛЬКА.

РЭПАРТАЖ

Жыццё — транзіт за шчасцем...

Сфера нелегальнай міграцыі па магчымасці зарабляць шалёныя грошы стаіць у свеце на трэцім месцы пасля гандлю зброяй і наркотыкамі. Скажам, пераправіць аднаго чалавека нелегальным шляхам з Кітая ў Еўропу каштуе сёння каля 15 тысяч долараў. Амаль уся гэтая сума асядае ў кішэнях непасрэдных арганізатараў незаконнага бізнесу. Што ж да саміх мігрантаў — нават такія вялікія грошы не могуць гарантаваць ім здзяйснення запаветных мараў аб якой-небудзь еўрапейскай краіне. Іх «кідаюць» тыя, хто ў хуткім часе абяцаў прыгожае жыццё (быў выпадак, калі мігрантаў пасадзілі на цягнік у метро, сказаўшы літаральна наступнае: наступны прыпынак — Германія), іх затрымліваюць міліцыя і пагранічнікі. А яны ўсё едуць — з розных краін, але з аднолькавай марай пра лепшае жыццё. У апошнія гады паток мігрантаў праз Беларусь значна ўзрос. Дзякуючы даволі празрыстай мяжы з Украінай і найперш з Расіяй нелегалы абралі нашу краіну, бадай, асноўным перавалачным пунктам на шляху ў Еўропу. Адкрыўшы ў гэтыя суседнія краіны візы, яны спакойна прыязджаюць у Беларусь, каб потым паспрабаваць дасягнуць канчатковай мэты свайго доўгага падарожжа...

...Паводле даных аператыўнай работы, стала вядома, што паблізу Мінска выяўлена чарговая група нелегалаў з краін Азіі, якая ў хуткім часе гатова паспрабаваць перайсці беларускую граніцу. У сумесна распрацаваных аператыўных мерапрыемствах па затрыманню мігрантаў прымаюць удзел супрацоўнікі Упраўлення Камітэта дзяржбяспекі па Мінску і Мінскай вобласці, Упраўлення пашпартна-візавай службы МУС, Сталічнага Маскоўскага аддзела пашпартна-візавай службы, а таксама спецпадраздзяленне пагранічных войскаў. Толькі ў «РАФіку» мне паведамляюць канчатковую мэту нашага падарожжа — вёска Шчомысліца Мінскага раёна. Ад цэнтра горада — усяго 15—20 хвілін язды, і вось мы збочваем з трасы на звычайную вясковую вуліцу. Непрацяглы прыпынак, падчас якога коратка, але дакладна каардынуецца злажанасць дзеянняў розных сілавых структур.

«Наша мэта — тры дамы, усе на адной вуліцы, на адным баку. Не даць нікому збегчы. Заязджаем з двух канцоў вуліцы, адна машына страхуе з боку агародаў. 2-3 хвіліны, каб заняць свае месцы, потым пад'язджае асноўная група. Глядзець за вокнамі, самі ведаеце, скачуць практычна з любога паверха. Транспарт не выпускаць, у выпадку чаго — страляць толькі па колах».

«Гэта прадстаўнік «Звязды», — ужо пра мяне, — наглядайце, пажадана, каб ён не пацярпеў, рознае бывае...»

Кароткая каманда, і калона машын паціху рухаецца па амаль пустой вясковай вуліцы. Рэдкія пешаходы з цікаўнасцю пазіраюць на незвычайную кавалькаду. «Як на вяселле», — жартуе нехта ў мікрааўтобусе. Нібы пачуўшы гэта, пярэднія легкавікі паддаюць газу і знікаюць недзе наперадзе. «РАФік», упёршыся ў чыгуначныя пуці ў канцы вуліцы, заціхае. Чаканне доўжыцца нядоўга: па сігналу, што ўсе ўжо на сваіх месцах, мы пад'язджаем да першай хаты.

...У доме прапісаны гаспадыня, жанчына 1931 года нараджэння, яе муж і дачка з унукам. Але ў двары ёсць яшчэ летні домік. Яго жыхары — чатырнаццаць цёмнаскурых маленькіх чалавечкаў ну ніяк не падобныя на блізкіх сваякоў з Пухавіч, якія нечакана «зваліліся на галаву» гаспадарам. Жанчына ў адказ на пытанне адносна «гасцей» тлумачыць нешта накшталт таго, што папрасіліся заначаваць (як у тым анекдоце: дайце папіць, бо так есці хочацца, што прама заначаваць няма дзе). «Начуюць» такім вось чынам ужо тыдні са два. «Было пяць, зараз больш, можа, ноччу набеглі?»

...У памяшканні ўсяго тры ложкі, само яно па памерах не больш за аднапакаёвую кватэру, паўсюды смецце, валяецца адзежа. Спяць нелегалы альбо на падлозе, або «валетам» па пяць чалавек у ложку. Ядуць нярэдка адзін раз у дзень якую-небудзь кашу («могуць і ўвогуле днямі абыходзіцца без ежы», — паведамілі супрацоўнікі міліцыі), з адной вялікай каструлі або тазіка. За харчаваннем звычайна ходзяць гаспадары, даўшыя прытулак.

— Хто разумее па-руску? Хто гаворыць на англійскай мове?

У адказ цішыня, але вочы некалькіх выдаюць, што нас яны цудоўна разумеюць.

— Дзе вашы пашпарты?

Чатырнаццаць пар вачэй — сама кранальная пакорлівасць, маўляў, што з нас узяць, непісьменных. Дзіцячыя фігуры, хаця некаторым з іх ужо пад трыццаць гадоў. Нягледзячы на холад нават у памяшканні, амаль на ўсіх з адзення футболкі і нешта накшталт спадніцы ў нашым разуменні. Усе — басанож. Абутак стаіць асобна — новенькія красоўкі і чаравікі. «Мабыць, купілі ўжо тут», — зазначае нехта.

— Добра, будзем размаўляць на мове жэстаў. Вось гэтая сумка — твая? А чаравікі — гэтыя? Забірай усё і — на выхад.

Мабыць, зразумеўшы, што іншага выйсця няма, усе пачынаюць варушыцца і разбіраць свае рэчы. Потым па аднаму нелегалаў выводзяць у другі пакой на асабісты дагляд. На стол выкладваюцца ўсе колюча-рэжучыя прадметы, цыгарэты (многія з іх з нацыянальным наркотыкам), медыкаменты (іх чамусьці вельмі шмат у кожнага), запісныя кніжкі (тут могуць быць беларускія нумары іншых кватэр і дамоў, дзе небаракі шукаюць часовага прытулку), грошы. Купюры па долару, пяць, дваццаць, сто «баксаў» схаваныя ў каўнярах кашуль, поясе джынсаў. «Аднойчы вось так знайшлі нават 30 тысяч долараў», — гавораць мне. Пасля праверкі сапраўдныя медыкаменты і ўсё астатняе вернуць уладальнікам. Акрамя грошай. Па нашаму заканадаўству нелегалаў нельга затрымаць, калі ў іх ёсць пашпарты. Шлях адзін — выслаць іх туды, адкуль яны прыехалі. Калі грошай няма — нелегалам за кошт дзяржавы купляюць білеты на электрычку, калі ёсць — за іх бяруць праязныя дакументы на цягнік і вылічваюць штраф за парушэнне правілаў уезду і знаходжання ў нашай краіне. У «нашых» пашпарты ёсць — адзін грамадзяніна Пакістана (ён быў затрыманы як адзін з арганізатараў незаконнай міграцыі), астатнія — Бангладэш і Індыі.. Пакрысе на стале расце і стос зялёных купюр — значыць, назад у Расію (ва ўсіх расійскія візы) паедуць з нейкім камфортам.

Пакуль працягваецца дагляд, іду ў наступную хату, дзе таксама знайшлі групу такіх жа небарак — 17 чалавек. Паветра тут яшчэ больш цяжкае, пакойчык, дзе на падлозе ляжаць і сядзяць нелегалы, меншы. Наогул у хаце страшэнная галеча, падлога даўно не бачыла ні фарбы, ні веніка, брудныя раскіданыя ложкі ў суседніх пакоях (дарэчы, у адным з іх стаяў дзіцячы веласіпед, кошт якога, мабыць, пенсія за год гаспадыні), мурзатыя дзеці. Іх, дарэчы, у гаспадароў дванаццаць, усе дзяўчынкі. У адной са старэйшых муж — выхадзец адтуль жа, што і ўсе кватаранты. Пасля вуліцы дыхаць ад смуроду цяжка, здаецца, паветра можна фізічна памацаць. Гаспадыня, зразумела, нічога не ведае, «пастаяльцаў прывезлі на трох таксі, абяцалі заплаціць, калі будуць забіраць групу». Мне коратка паведамляюць, што ў гэтай хаце ўжо аднойчы затрымлівалі нелегалаў. Дачка гаспадыні тады кінулася на міліцыянераў з цаглінай: не чапайце мужа. ...Хочацца выйсці на вуліцу і закурыць.

...Што штурхае гэтых людзей у небяспечны шлях? Гавораць, на іх радзіме вельмі цяжкае жыццё, беспрацоўе, няма заробкаў. Але з каляровых фотаздымкаў пазіраюць шчаслівыя радасныя твары: сем'і, уласныя бацькі і дзеці. На картках можна заўважыць і дываны, і неблагую мэблю, хтосьці некалі адпачываў на Мальдзівах. Дужыя, спакойныя мужчыны — на каляровых паперках, і скурчаныя, напалоханыя дзеці — хлапчукі ў смуродзе на бруднай падлозе — тут... Але... Было знойдзена некалькі фотаздымкаў, дзе яны зняты са зброяй у руках, у ваеннай форме. На целе аднаго з мігрантаў былі адметіны ад кулявых раненняў. Усё гэта таксама не можа не наводзіць на пэўны роздум. Якая канчатковая мэта іх шляху, што яны вымушаны згадзіцца на такое, няхай часовае існаванне? Пералёт з Бангладэш, Індыі або Пакістана каштуе вельмі дорага, таму звычайна грошы збіраюць усе сваякі. Даедзе да Германіі, уладкуецца — абавязкова выцягне астатніх. Месца працы ў іх там толькі адно — падпольныя цэхі, цяжкая праца ўвесь дзень на нелегальным становішчы. Але — калі заедзе, калі не вышлюць ці то з Германіі, ці то з Бельгіі, любой іншай краіны ўлады. І ўсё ж едуць, спадзеючыся, відаць, толькі на сваю шчаслівую зорку. Транзітам праз нашу краіну, а падаецца — транзітам праз уласнае жыццё ў пошу[illegible] лепшай долі, якая від[illegible] цяг[illegible]ніка або сама[illegible] кучы, асабіста мне [illegible] х людзей. І я не [illegible] авіта больш злуе: іх [illegible] акорлівасць, ці тое [illegible] ушае гэтых небарак [illegible]. Гэта эмоцыі, ал[illegible] у вачах іх была н[illegible] але і — туга. Магчы[illegible]е...

Калі ж без [illegible] ы вінаватыя ў іх б[illegible] наша краіна павінн[illegible]ць за мігрантаў. Зра[illegible]ы не ад добрага ж[illegible]а небяспечным бі[illegible]аюць да сябе ў хату [illegible]алаў. Упэўнены, ніх[illegible]ваецца, што «госц[illegible]аін — гэта яшчэ і кр[illegible]кванне наркотыкаў [illegible] рэшце рэшт — хва[illegible]ў таму ў Мінск ха[illegible]авіта яны — нелегал[illegible]. Па інфармацыі Дзя[illegible]а пагранічных вой[illegible]атрымання кожна[illegible] дзяржаве (пад[illegible] ў суму не мен[illegible]біце і са сваі[illegible] шчасцем...

***P.S.** На момант выхаду матэрыялу 30 чалавек у суправаджэнні работнікаў міліцыі былі выдвараны за межы Рэспублікі Беларусь.*

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

БЕЛАРУСЬ НЕ АДСТАЕ АД СУСВЕТНЫХ СТАНДАРТАЎ У АБАРОНЕ АЎТАРСКІХ ПРАВОЎ

Навукова-тэхнічны прагрэс, які абарочваецца стварэннем новых лічбавых тэхналогій і развіццём глабальнай інфармацыйнай сеткі «Internet», зразумела, патрабуе і новых правілаў абароны аўтарскіх і сумежных правоў. Гэта разумеюць у Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці, з якой Беларусь у снежні 1996 года падпісала адпаведны дагавор.

Учора парламентарыі ратыфікавалі гэты дакумент, заявіўшы тым самым, што наша краіна таксама прытрымліваецца прынятых у свеце стандартаў па захаванню аўтарскіх і сумежных правоў.

Адначасова з гэтым дагаворам ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу быў ратыфікаваны Дагавор Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці па выкананню і фанаграмах. Яго назва сама за сябе гаворыць пра сферу, якую рэгламентуе дакумент.

Трэцім дакументам, які на ранішнім пасяджэнні 14 мая паспелі адобрыць дэпутаты, сталі папраўкі і дапаўненні ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс. Яны ўносяць некаторыя карэктывы ў парадак разгляду крымінальных спраў следчымі і судовымі органамі. Праўда, парламентарыі не пагаджаліся з некаторымі змяненнямі. Іх пазіцыя тлумачылася апасеннем таго, што следства па складаных крымінальных справах можа быць ускладнена, у выніку чаго будуць парушацца правы людзей. Аднак прадстаўнікам сілавых органаў удалося пераканаць дэпутатаў у беспадстаўнасці такіх апасенняў, таму ў выніку законапраект быў адобраны ў першым чытанні.

Юрась ЛЯШКЕВІЧ.

КУРСЫ АБМЕНУ НАЯЎНЫХ ВАЛЮТ У КАМЕРЦЫЙНЫХ БАНКАХ І АФІЦЫЙНЫ КУРС, УСТАНОЎЛЕНЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ БАНКАМ НА 14 МАЯ 1998 г. (па стану на 15.00)

Назва банка	USD		DM		RUR		Тэлефон для даведак
	Купля	Продаж	Купля	Продаж	Купля	Продаж	
Мінск (0-17)							
Белпрамбудбанк	46000	47000	25500	26500	7300	7650	233-2110
Мінсккомплексбанк	46500	47000	26150	26450	7600	7650	228-2047
Пріорбанк	46500	47000	25500	26450	7500	7650	245-5721
Нацыянальны банк РБ (для заліку)	35230.00		19842.25		5730.00		Курс на 15.05.1998
Цэнтрабанк Расіі	5.1440		3.4540				

[illegible]

Рынкавы камінальны курс	68200	69200	38416	38900	11098	11262
Рэальна абгрунтаваны камінальны курс	55500	56500	31000	31500	8700	9200

Агенцтва ГРАЙЦОВА.

КАМАНДЗІРОЎКА ПА ЗВАНКУ ЧЫТАЧА

ПАДЗЕЛ

Варта сказаць адразу, што ў той самы дзень, калі ў рэдакцыі прагучаў званок з Капыльскага раёна і калі карэспандэнт газеты выехаў на месца, канфлікт з зямлёй у саўгасе «Лясное» ўжо пайшоў на спад. Тым не менш, сітуацыю ў нечым можна назваць паказальнай.

Як тое нярэдка бывае, выбух грымнуў нечакана. Справа ў тым, што ў асабістае карыстанне ўсім жыхарам вёскі было выдзелена па 60 сотак ворыва, прычым непасрэдна пры сядзібах сотак па 15—20, астатнія ж, адпаведна, — на землях сельсавета. Шмат гадоў у «Лясным» існавала такая практыка: каб забяспечыць севазварот, саўгас і сельсавет мяняліся палямі. [illegible]


Падзел сёлета разгараўся прыкладна так. Кіраўніцтва саўгаса вырашыла перш-наперш задаволіць інтарэсы менавіта «сваіх». Па прапанове дырэктара Аляксандра Грыцкевіча («саўгас не павінен быць вялікім райсабесам») усіх грамадзян падзялілі на катэгорыі. [illegible] асобнае поле. Участкі астатніх жыхароў вёскі (у гэтую катэгорыю, заўважым, трапілі работнікі мясцовага дзіцячага садзіка, пошты, крамы, тэхперсаналу школы і г. д.) застаюцца на землях сельсавета. Здавалася б, чыстая фармальнасць. [illegible] Калі б не адно: паралельна гаспадарка пачынае ўзворваць як землі сваіх работнікаў, так і землі сельсавета. Прычым узворвае без папярэдняга размеркавання саміх участкаў.

Што адбылося потым, прадказаць няцяжка. [illegible] скаргамі ў райвыканкам.

Да гонару мясцовай улады, доўга чакаць рэакцыі не давялося, і размеркаванне разараных ужо ўчасткаў усё ж пачалося. На першы погляд, усё стала на свае месцы. [illegible] «нашых». Або, па словах не працуючых у саўгасе, на «чорных» і «белых». Услед за зямлёй на два амаль што варожыя лагеры аказалася падзеленай і сама вёска...

Сяргей ГРЫБ.

Капыльскі раён.



ТАКАЯ ПАСЛУХМЯНАЯ ГЛІНА...

у руках мастака і ганчара з Браслава Валерыя Зінкевіча. Працуючы ў мясцовым музейным аб'яднанні кіраўніком гуртка ганчарства і глінянай пластыкі, майстар імкнецца адрадзіць некалі традыцыйны для Браслаўшчыны, але, на жаль, ужо адышоўшы тут промысел. Калісьці ў горадзе сярод азёр працавала над глінянымі посудам адзіная ў Беларусі жанчына-ганчар — Ніна Кузьмінава. Яе вырабы і дагэтуль ва ўжытку многіх сялянскіх і гарадскіх гаспадарак. [illegible] Валерый Зінкевіч і іншыя супрацоўнікі музейнага аб'яднання вераць, што, як і ў колішнія часы, Браслаў будзе славіцца сваімі керамікай і ганчарствам.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ І ЎЛАДА: У КАНТАКЦЕ ЦІ ПААСОБКУ?

Гэтае пытанне было цэнтральным падчас нарады з удзелам прадпрымальнікаў і кіраўнікоў уладных структур Гродзеншчыны.

Намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Міхаіл Бяляеў назваў прадпрымальніцтва важным сектарам народнай гаспадаркі і прывёў такія лічбы. Летась у вобласці не дапушчана масавага скарачэння кадраў і створана 9,5 тысячы новых рабочых месцаў, а ў першым квартале сёлетняга года — яшчэ 1375. У гэтым вялікая заслуга прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасці. Дарэчы, ужо пасля рэспубліканскай перарэгістрацыі ў Прынёманскім краі створана 912 новых МП плюс 3645 суб'ектаў гаспадарання без утварэння юрыдычнай асобы. Бюджэт і пазабюджэтныя фонды атрымалі ад недзяржаўнага сектара эканомікі звыш 660 мільярдаў рублёў, што складае 7,4 працэнта ад даходнай часткі.

Але часта зацягваецца працэдура рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання без утварэння юрыдычнай асобы, мэтазгодна даручыць яе непасрэдна райвыканкамам. Патрэбны льготы па падаткаабкладанню для пачынаючых прадпрымальнікаў, каб дапамагчы ім стаць на ногі. Неабходны льготныя ўмовы арэнды былых ваенных гарадкоў, інакш цяжка зацікавіць камерцыйныя структуры ў іх выкарыстанні. Аблвыканкам яшчэ раз звярнуўся ва ўрад з гэтай прапановай.

Шмат болевых кропак абазначылі на нарадзе і прадпрымальнікі. Гэта, у прыватнасці, узаемаадносіны з падатковай службай, якія адзін з прамоўцаў назваў «вуліцай з аднабаковым рухам», адсутнасць зразумелага і простага заканадаўства, цяжкасці, звязаныя з коштам і парадкам сертыфікацыі тавараў на месцах... «На словах быццам бы ўсе за прадпрымальніцтва, а на справе перыядычна ўзнікаюць перашкоды» — гучала з трыбуны. Тым не менш падкрэслівалася, што трэба рабіць упор не на ўзаемныя прэтэнзіі прадпрымальнікаў і дзяржаўных структур, а не сумесны пошук вырашэння існуючых праблем.

На Гродзеншчыне ўжо завершаны выбары дэлегатаў на маючы адбыцца рэспубліканскі з'езд прадпрымальнікаў. Па словах начальніка ўпраўлення прадпрымальніцтва Міністэрства прадпрымальніцтва і інвестыцый Сяргея Гараева, міністэрства бачыць сваю ролю ў гэтым пытанні як арганізацыйную і тэхнічную і цвёрда стаіць на пазіцыі неўмяшання ў працэс волевыяўлення прадпрымальнікаў. З'езд — гэта форум не саюзаў і іншых грамадскіх аб'яднанняў, а ўсіх прадпрымальнікаў. Толькі яны могуць вырашыць, ці патрэбен ён наогул і якія праблемы павінен абмеркаваць.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

НАЙЛЕПШЫ ЛОСЬ — МЁРТВЫ?

На глеевую пляцоўку ачышчальных збудаванняў трапілі два маладыя ласі. Іх выцягнулі з глею. Адзін лось падаўся ў лес, а другі ў Баранавічы, да завода бытавой хіміі. Тут, каля прахадной, ён і трапіў у абгароджаную стаянку для аўтамашын.

Раніцай, каля стаянкі сабраліся не толькі работнікі завода, але і прадстаўнікі службаў экалогіі, лясгаса... Лось кідаўся па пляцоўцы і разбіў лабавое шкло ў аўтамабілі. А калі яго выпусцілі, то ён, дрэнна арыентуючыся ў горадзе, не пабег шукаць дарогу ў лес, а кінуўся праз чыгунку да разгрузачнай пляцоўкі завода, якая знаходзіцца побач з вагонным дэпо.

Тут лася і застрэлілі. Паляўніцтвазнавец Уладзімір Мязяк сказаў: «Лось быў узбуджаны і кідаўся на людзей. Магчыма, быў шалёны». Хаця не выключана, што звер ашалеў ад цікаўных, якія не пакінулі лася ў спакоі. Але ж чаму звера не ўсыпілі і не вывезлі за горад на волю? Аказалася, што ў нас страляюць толькі баявымі патронамі. Іншых не аказалася.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

«ПАДАРУНАК» ДЛЯ ЦЕШЧЫ

Пасля апублікавання ў «Звяздзе» артыкула «Аўтамабіль, які прыносіць выдаткі», атрымаў вельмі шмат пісьмаў, зваротаў, просьбаў аб дапамозе. За ўсім гэтым зўна бачыцца тое, што большасць грамадзян, так ці інакш звязаных з набыццём за мяжой аўтамабіляў замежных марак, проста незнаёмыя з існуючым заканадаўствам, падчас дапускаюць парушэнні закона і нясуць за гэта адказнасць, не разумеючы сутнасці свайго парушэння. Таму, думаю, мэтазгодна будзе вярнуцца да тэмы яшчэ раз больш падрабязна.

Справа яшчэ і ў тым, што калі на Полацкай, Віцебскай, Пастаўскай мытнях работа па палажэнню № 315 Савета Міністраў ужо вядзецца поўным ходам, то на Верхнядзвінскай, Астравецкай мытнях яна толькі пачынаецца. І ў грамадзян, па ўсім відаць, там будзе нямала непрыемнасцяў, зноў жа ад няведання існуючых палажэнняў.

Дык звернемся да дакумента, які і выклікаў цэлую хвалю абурэння сярод уладальнікаў іншамарак. У красавіку мінулага года Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь за № 315 зацверджана Палажэнне аб парадку перамяшчэння фізічнымі асобамі асабістай маёмасці праз мытную мяжу Рэспублікі Беларусь. 24-ы пункт яго сведчыць аб тым, што пры ўвозе фізічнымі асобамі ў Рэспубліку Беларусь аднаго транспартнага сродку (незалежна ад краіны паходжання і тэрміну эксплуатацыі) яго мытнае афармленне ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным Дзяржаўным мытным камітэтам з прымяненнем стаўкі мытнай пошліны ў памеры 0,3 ЭКЮ за адзін кубічны сантыметр аб'ёму рухавіка. Але ўвезены з захаваннем гэтых правілаў транспартны сродак не павінен адчужвацца альбо перадавацца ў карыстанне ці ва ўласнасць іншым асобам, акрамя членаў сям'і асобы, якая ўвезла дадзены транспартны сродак, на працягу двух гадоў з даты ўстанаўлення мытнага рэжыму.

Усё нібыта зразумела. Але гэтым жа Палажэннем вызначаны канкрэтны тэрмін: «член сям'і». Гэта — муж (жонка), бацькі, дзеці, родныя браты і сёстры, усынавіцелі, дзед, бабуля, унукі, а таксама непрацаздольныя ўтрыманцы, якія сумесна жывуць і вядуць агульную гаспадарку з асобай, якая вывезла транспартны сродак.

Але ж у нашай краіне існуе яшчэ і інстытут, як інстытут прапіскі. Менавіта па ёй вызначаецца месца жыхарства чалавека найперш. І калі сын не прапісаны ў маці, хаця і жыве разам з ёй афіцыйна, ён ужо не з'яўляецца членам яе сям'і, ён ужо не можа свабодна карыстацца набытым аўтамабілем. Вось тут і пачынаюцца розныя непаразуменні.

Правамерным будзе пытанне, чаму пачало так актыўна дзейнічаць Палажэнне менавіта цяпер, хаця прынята яно год таму? Як растлумачыў мне начальнік аддзела расследаванняў Пастаўскай мытні Мікалай Тарасаў, на самай справе работа гэта вялася ўвесь час. Проста цяпер назіраецца своеасаблівы пік скаргаў, зваротаў, прыцягнута ўвага грамадскасці. Падключыліся да справы органы пракуратуры, дзейнасць якіх таксама скіраваная на выяўленне грамадзян, не зусім чыстых перад законам.

Ну а сярод грамадзян, якія набылі, а потым прадалі ці перадалі або прадастаўляюць права карыстання сваёй іншамаркай, нешта падобнае на паніку. І паверце, іх не так ужо і мала, каб не звяртаць увагі на гэтую праблему. І як заўсёды ў нашых стасунках, хапае тут і смешнага, і вельмі-вельмі сумнага.

Позна ўвечары знайшла мяне грамадзянка Я. Можна сказаць, што была жанчына ў сапраўднай паніцы. Ды, шчыра сказаць, ёсць ад чаго і панікаваць. Вось вытрымка з афіцыйнага паведамлення Пастаўскай мытні: «...згодна з Пастановай па справе аб адміністрацыйным мытным правапарушэнні № .... вам неабходна аплаціць суму мытнай пошліны ў памеры 1.160.730.000 рублёў. Указаная сума запазычанасці ўтварылася ў выніку перадачы аўтамабіля «Опель Кадэт», рухавік №... кузаў №.... у карыстанне без дазволу мытных органаў».

Яшчэ раз уважліва паглядзеў на лічбы. Так. Мільярд 160 мільёнаў рублёў. Лічба астранамічная, гэта амаль 24 тысячы долараў. Ды стары «апялёк» «цягне» не больш як на дзве тысячы.

Потым, у мытні, усё высветлілася: аказваецца, памылка, заплаціць трэба 116 мільёнаў, проста недагледзелі лішнюю лічбу «нуль». Але колькі гэта каштавала нерваў, зразумела. Увогуле ж, грамадзянцы Я. «падарыў» 116 мільёнаў яе зяць. Не, ён не быў затрыманы ў час кіравання «Опелем», але ў час размовы ў мытні прызнаў і падпісаў свае паказанні ў тым, што машыною цешчы карыстаўся самастойна. Тая гэты факт катэгарычна адмаўляе. Так што канчатковае слова скажа суд.

А вось дзядуля Н., напэўна, так і не зразумее, у чым яго віна. Унук, купіўшы на яго аўтамабіль, хуценька прадаў яго, не дачакаўшыся зыходу двухгадовага тэрміну. І ён цяпер зусім убаку. За ўсё даводзіцца адказваць дзядулю, а той і распісацца не ўмее.

Увогуле, наколькі я зразумеў, вельмі няпроста сёння даводзіцца работнікам мытні, асабліва з аддзела мытных расследаванняў. Існуючае заканадаўства, палажэнні патрабуюць ад іх выяўлення парушэнняў, дзеянняў па спагнанні з грамадзян-парушальнікаў у рэспубліканскі бюджэт вельмі і вельмі вялікіх сум. Гэта, у рэшце рэшт, іх службовы абавязак. Але жыццё ёсць жыццё, і часам чарговая аформленая і перададзеная ў суд справа каштуе вялікіх нерваў, маральных і псіхалагічных страт. Дарэчы, з 15 ліпеня плануецца ўступленне ў сілу новага Мытнага кодэкса, які значна павялічвае адказнасць грамадзян за адміністрацыйныя парушэнні пры мытным афармленні. Адзін прыклад: цяпер за ўтойванне рэчаў пры мытным афармленні прадугледжваецца канфіскацыя і штраф ад 1 да 10 мінімальных зарплат, а надалей прадугледжваецца за гэта парушэнне штраф у памеры ад 100 да 200 працэнтаў кошту рэчаў і таксама іх канфіскацыя. Мытня набудзе большыя паўнамоцтвы, у тым ліку і пры правядзенні сваіх следчых мерапрыемстваў.

Застаецца дадаць, што ўвесь час гаворка ў нас ідзе пра фізічных асоб, пра тых, хто купляе аўтамабіль за мяжой найперш для сябе. Тыя ж «гоншчыкі», якія зрабілі перагонку аўтамабіляў сваім бізнесам, даўно знайшлі выйсце: цяпер яны перапраўляюць купленыя ў Літве аўтамабілі праз мяжу трэйлерамі, як тавар, а гэта ўжо іншыя пошліны, іншыя падыходы.

Алесь КАСЦЕНЬ.

КАНЦЭПЦЫЯ І ПРАГРАМА РАЗВІЦЦЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ КРАІНЫ НА 1998—2015 ГАДЫ СКІРАВАНА НА БОЛЬШ ПОЎНАЕ ЗАДАВАЛЬНЕННЕ ПАТРЭБ ЛЮДЗЕЙ У НОВЫХ СУЧАСНЫХ СРОДКАХ ВЫТВОРЧАСЦІ І ВЫСАКАЯКАСНЫХ ТАВАРАХ НАРОДНАГА СПАЖЫВАННЯ

Прамысловасць — гэта ці не самы важны комплекс краіны. Менавіта ён з'яўляецца галоўным пастаўшчыком сродкаў у бюджэт, а значыць падтрымлівае навуку, сацыяльную сферу, многія дзяржаўныя інстытуты. Таму такая ўвага ўдзяляецца кіраўніцтвам краіны яго далейшаму ўдасканаленню. Праекты канцэпцыі і праграмы развіцця прамысловасці, як вядома, былі разгледжаны на нядаўняй нарадзе ў прэзідэнта краіны. У іх дадзены аналіз стану прамысловасці, сфармуляваны мэты, задачы, прыярытэты і этапы яе развіцця. Пра гэта — гутарка з галоўным саветнікам упраўлення прамысловага комплексу апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Іванам САЛАДУХАМ.

— У праграме акрэслены асноўныя напрамкі і параметры развіцця прамысловага комплексу на 1998—2015 гады. Закладзеныя паказчыкі на такую працяглую перспектыву максімальна напружаныя, што запатрабуе і адпаведнай арганізацыі работы па іх выкананню.

— Праграма, сапраўды, разлічана на працяглы тэрмін і вельмі напружаная. Але, як адзначыў прэзідэнт на нарадзе, яна павінна быць рэальнай, таму што разлічана на выкананне не толькі цяперашнім пакаленнем. Гэта датычыцца як росту аб'ёмных паказчыкаў (180—185 працэнтаў да ўзроўню 1997 года), так і якасных (зніжэнне да 45 працэнтаў каэфіцыента зносу асноўных фондаў, выпуск 85 працэнтаў прадукцыі, якая адпавядае сусветным стандартам якасці, дасягненне рэнтабельнасці ў цэлым па прамысловасці да 24—26 працэнтаў і г.д.).

З другога боку, намечаныя таксама параметры зніжэння матэрыяла- і энергаёмістасці прадукцыі, узровень якіх у 2-3 і больш разоў перавышае замежныя аналагі, павінны лічыцца мінімальнымі.

Распрацоўку бягучых і перспектыўных прагнозаў сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі нам трэба ажыццяўляць на аснове паказчыкаў, закладзеных у Праграме развіцця прамысловага комплексу, якія пры неабходнасці, з улікам сітуацыі, уплыву ўсіх фактараў, могуць быць скарэкціраваны. Галоўнае — забяспечыць паэтапную рэалізацыю праграмы. Тут урад мае намер праводзіць курс на стварэнне ўмоў для арганізацыі сучасных прамысловых прадпрыемстваў і высокатэхналагічных вытворчасцяў, якія выпускаюць складаную навукаёмістую прадукцыю, пры дапамозе акцыяніравання, рэструктурызацыі, канцэнтрацыі рэсурсаў і сродкаў на прыярытэтных напрамках, зніжэння прамога ўдзелу дзяржавы ў гаспадарчай дзейнасці, умацавання рыначных механізмаў пры дакладным дзяржаўным рэгуляванні і кантролі рамачных умоў дзейнасці эканамічных суб'ектаў гаспадарання.

— Іван Анатольевіч, што паказваюць разлікі, тэндэнцыі ў развіцці прамысловасці? Ці зможам мы ў 2001 годзе выйсці на ўзровень 1990 года?

— Размова ідзе не пра аднаўленне ранейшых аб'ёмных паказчыкаў (пры адсутнасці попыту на многія віды прадукцыі), а пра пашырэнне і абнаўленне наменклатуры, павышэнне якасці і канкурэнтаздольнасці выпускаемай прадукцыі, павелічэнне экспартнага патэнцыялу нашай дзяржавы і на гэтай аснове эфектыўнасці вытворчасці.

Пры правільнай ацэнцы таварных і інвестыцыйных рынкаў мы цалкам у стане аднавіць і перасягнуць узровень вытворчасці па многіх відах прадукцыі, у тым ліку па бытавой тэхніцы, цэлюлозна-папяровай, дрэваапрацоўчай, лёгкай прамысловасці. Размова ідзе аб прамысловасці, якая базіруецца ў многім на ўласнай сыравіне і мае вызначаную навукаёмістасць.

— Пытанні якасці і канкурэнтаздольнасці з'яўляюцца таксама прыярытэтнымі?

— Так. Распрацаваны галіновыя праграмы «Якасць». У першым паўгоддзі ва ўрадзе будзе разгледжана рэспубліканская праграма «Якасць». Трэба разам з рэалізацыяй мераў па рэканструкцыі, тэхнічнаму пераўзбраенню, мадэрнізацыі вытворчасці, закладзеных у абмяркоўваемай сёння праграме, узмацніць дзяржаўнае рэгуляванне ў галіне якасці, якое павінна стаць у рэспубліцы складанай часткай адзінага механізма дзяржаўнага кіравання эканомікай.

Важнейшымі інструментамі тут павінны стаць стандартызацыя і сертыфікацыя. У першым выпадку ўвядзенне жорсткіх стандартаў павінна стымуляваць інвестыцыі і інавацыі, а гэта будзе спрыяць атрыманню пераваг на знешніх рынках, што пацвярджае вопыт перадавых краін, у прыватнасці Японіі. У другім выпадку сертыфікацыя з'яўляецца гарантыяй стабільнасці вытворчасці, магутным стымулам прасоўвання прадукцыі як на знешнім, так і на ўнутраным рынках.

— Апошнім часам не запатрабавана была акадэмічная, вузаўская і галіновая навука. Ці зменіцца сітуацыя ў гэтым плане?

— Выходзячы з закладзеных у праграме параметраў па выхаду к 2015 году на выпуск прадукцыі, якая забяспечвае ў асноўным патрабаванні міжнародных стандартаў, трэба ўзнімаць галіновую навуку для вытворчасці тэхнічна складанай прадукцыі. Ажыццявіць тут неабходную рэструктурызацыю не шляхам драблення, а шляхам стварэння новых структур на базе прадпрыемстваў, навукова-даследчых інстытутаў і канструктарскіх бюро.

Трэба адмовіцца ад таго, чаго мы не дасягнулі і не дасягнем, а ўзяцца за тое, што мы захавалі і можам развіваць (тэлевізійныя, камутацыйныя і інфармацыйныя сістэмы, інтэгральныя мікрасхемы, оптыка-механічныя прыборы і г.д.).

Трэба, сапраўды, запатрабаваць акадэмічную навуку, надаць ёй дакладна выяўлены прыкладны характар, замацаваць за вядучымі прадпрыемстамі і перспектыўнымі напрамкамі развіцця прамысловасці акадэмічныя інстытуты. Многія з іх з ліквідацыяй Саюза, як вядома, страцілі сваю ролю.

— Праграма ў першую чаргу накіравана на істотнае павелічэнне экспарту.

— Аналіз паказвае, што таварная структура імпарту па многіх пазіцыях супадае з наменклатурай вырабаў, выпускаемых айчыннай прамысловасцю. Таму, пры правядзенні адпаведнай работы, у першую чаргу па павышэню якасці выпускаемай прадукцыі, зусім рэальна выкананне праграмы імпартазамяшчэння, дасягненне апераджальнага росту экспарту над імпартам.

Цяпер можна ўпэўнена і абгрунтавана сцвярджаць, што наша прадукцыя яшчэ мае свой рынак у Расіі і шэрагу краін СНД і гэта з'яўляецца важным фактарам перспектыў нашага развіцця ў будучыні.

Пры ўсіх недахопах нашых інвестыцыйных і спажывецкіх тавараў яны ўстойлівыя ў шэрагу ніш еўразійскага рынку.

Таму галоўным з'яўляецца правядзенне работы па ацэнцы кан'юнктуры таварных і інвестыцыйных рынкаў, прагназіраванне павелічэння іх ёмістасці і магчымасцяў збыту айчыннай прадукцыі на гэтых рынках. Гэта патрабуе развіцця маркетынгу, менеджменту, дылерскіх службаў і г.д.

— Іван Анатольевіч, вы сказалі, што ўзровень матэрыяла- і энергаёмістасці нашай прадукцыі ў 2-3 разы перавышае замежныя аналагі. Якім чынам будзе весціся зніжэнне выдаткаў вытворчасці, энергазберажэнне?

— У праграме закладзены параметры зніжэння выдаткаў вытворчасці, яны сапраўды на 2-3 парадкі вышэй, чым у развітых краінах, а па энергаёмістасці — яшчэ больш. Таму сёння не так важны аб'ём вытворчасці энергарэсурсаў. Важна задаволіць попыт пры больш эфектыўным іх выкарыстанні і зніжэнні агульнага спажывання.

У 1997 годзе энергаёмістасць валавога ўнутранага прадукту была зніжана на 8 працэнтаў, у гэтым годзе ёсць усе ўмовы, каб выйсці на 10 працэнтаў, г. зн. забяспечыць прырост вытворчасці прадукцыі без павелічэння спажывання энергарэсурсаў.

Неабходна забяспечыць вельмі жорсткі рэжым эканоміі на кожным прадпрыемстве, праводзіць пільную экспертызу закупляемых тэхналогій і абсталявання па паказчыках энергаспажывання.

Урадам нядаўна прыняты дадатковыя меры ў галіне энергазберажэння. Для павышэння кіруемасці і ўзмацнення ролі рэгіянальных органаў улады будуць даводзіцца заданні, накіраваныя на эфектыўнае выкарыстанне паліўна-энергетычных рэсурсаў.

— Выкананне такой напружанай праграмы, забеспячэнне ўстойлівага росту вытворчасці, мяркую, немагчыма без актывізацыі інвестыцыйнай дзейнасці ў прамысловасці.

— Выходзячы з таго, што знос асноўных вытворчых фондаў на многіх прадпрыемствах дасягнуў крытычнай адзнакі — 70 і больш працэнтаў, трэба ўстанавіць жорсткі кантроль за рэалізацыяй асноўных заданняў па рэканструкцыі, тэхнічнаму пераўзбраенню і мадэрнізацыі асноўнай вытворчасці, якія закладзены ў Праграму.

Разам з укараненнем новай амартызацыйнай палітыкі, за кошт якой у асноўным будуць забяспечвацца на 60—70 працэнтаў капітальныя ўкладанні, трэба змяніць падыходы да прыцягнення замежных інвестыцый.

Сёння замежных інвестараў разам з такімі неабходнымі фактарамі, як палітычная стабільнасць, заканадаўчая база, у немалой ступені цікавіць і ўзровень арганізацыі вытворчасці на саміх прадпрыемствах, іх фінансавае становішча. Таму пры паляпшэнні работы прамысловасці можна разлічваць на прыток замежнага капіталу.

— Некаторыя спецыялісты лічаць, што замежныя інвестары не ідуць да нас таму, што ў краіне марудна праводзіцца рэструктурызацыя і рэфарміраванне прамысловасці.

— Вопыт краін Усходняй Еўропы сведчыць аб тым, што немагчыма знайсці адзіны для ўсіх эфектыўны метад рэструктурызацыі, таму яе мэтазгодна праводзіць адначасова па некалькіх напрамках з улікам канкрэтных магчымасцяў дзяржавы і прадпрыемстваў.

Прамысловасць рэспублікі ў асноўным складаецца з буйных і сярэдніх прадпрыемстваў. На базе распрацаваных бізнес-планаў і праграм рэструктурызацыі прадпрыемстваў і аб'яднанняў трэба ажыццявіць меры па стварэнню канцэрнаў (ВА «БелаўтаМАЗ»), холдынгаў (Гомельскае станкабудаўнічае ВА імя С.М. Кірава, НВК «Планар», БМЗ), стварэнне філіялаў і дачыных кампаній, сумесных прадпрыемстваў.

З-за абмежаванасці фінансавых рэсурсаў селектыўная падтрымка будзе аказвацца тым галінам, вытворчасцям, якія маюць патэнцыяльныя магчымасці заваёўваць рынкі і не вычарпалі свайго патэнцыялу па выпуску высокаэфектыўнай і якаснай прадукцыі.

Сёння, калі асобныя галіны і вытворчасці рэзка скарацілі выпуск прадукцыі і аказаліся стратнымі, лепш, на мой погляд, укласці частку ўласнасці (вытворчых магутнасцяў) у сумесныя прадпрыемствы, каб атрымаць хуткую аддачу, новыя рабочыя месцы, якасную прадукцыю, чым утрымліваць стратныя прадпрыемствы.

Структурным пераўтварэнням будуць спрыяць і меры па рэарганізацыі і санацыі прадпрыемстваў, увядзенню працэдуры банкруцтва. Хоць апошняе з'яўляецца крайняй мерай, але ўжо факт яе прымянення ў многім прымусіць прадпрыемства перабудаваць сваю работу.

Немалаважнае значэнне мае стварэнне новых карпаратыўных структур, ФПГ і іншых, здольных забяспечыць устойлівую работу, акцыянерных таварыстваў з мінімальнымі выдаткамі вытворчасці і рэалізацыі.

Рэфарміраванне і рэструктурызацыя вытворчага сектара патрабуе выпрацоўкі адпаведнай рэгіянальнай палітыкі. Наспела неабходнасць распрацоўкі рэгіянальных праграм перспектыўнага развіцця прамысловасці на аснове стварэння ў рэгіёнах тэхнаполюсаў, тэхнапаркаў, зон высокіх тэхналогій, спецыяльных эканамічных зон і г.д.

— У рэалізацыі праграмы закладзены прынцып узмацнення ролі дзяржавы.

— У першую чаргу гэта датычыцца ўдасканалення заканадаўства, выпрацоўкі прадуманай стратэгіі ў падатковай, бюджэтнай, грашова-крэдытнай, інвестыцыйнай палітыцы, рэгуляванні эканамічнай дзейнасці, рэфарміравання дзяржаўных органаў кіравання.

Як бачна, Праграма прадугледжвае стварэнне макраэканамічных умоў, якія будуць садзейнічаць дынамічнаму развіццю прамысловасці, яе структурнай перабудове, распрацоўцы і ўкараненню новай тэхнікі і тэхналогій, павышэнню канкурэнтаздольнасці айчыннай прадукцыі і развіццю рынкаў збыту. Усё гэта дазволіць больш поўна задаволіць патрэбы народнай гаспадаркі і насельніцтва краіны ў сродках вытворчасці і таварах народнага спажывання. І праграма павінна адыграць тут сваю мабілізуючую ролю. Пасля падпісання прэзідэнтам адпаведнага ўказа ўрадам будуць распрацаваны меры ўсебаковага характару па яе рэалізацыі.

Уладзімір АНДРЫЕВІЧ.

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ПРЫВАТЫЗАЦЫІ ЖЫЛЛЁВАГА ФОНДУ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ»

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 10 красавіка 1998 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 17 красавіка 1998 года

Артыкул 1. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 красавіка 1992 года «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 15, арт. 247, № 27, арт.475; 1993 г., № 26, арт. 317; 1995 г., № 6, арт. 58) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. Артыкул 5 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«**Артыкул 5.** Не падлягаюць прыватызацыі:

жылыя памяшканні ў інтэрнатах;

службовыя жылыя памяшканні, акрамя службовых жылых памяшканняў у дамах саўгасаў;

жылыя памяшканні ў дамах, якія знаходзяцца ў зоне эвакуацыі (адчужэння), першачарговага і наступнага адсялення на тэрыторыях радыеактыўнага забруджання. Пры гэтым грамадзяне, якія пражываюць у зоне з правам на адсяленне, пры наяўнасці падстаў і жадання перасяліцца на пастаяннае жыхарства ў іншыя населеныя пункты, не маюць права прыватызаваць жылыя памяшканні, што займаюцца імі;

жылыя памяшканні, якія знаходзяцца ў жылых дамах, якія рэканструююцца або капітальна рамантуюцца, у выпадку перапланіроўкі (пераабсталявання) кватэр пры правядзенні работ па рэканструкцыі (капітальнаму рамонту) дома на перыяд з моманту пачатку правядзення работ і да заканчэння работ;

жылыя памяшканні, якія займаюцца ваеннаслужачымі воінскіх часцей, што выведзены або падлягаюць вываду за межы Рэспублікі Беларусь, ці ваеннаслужачымі, якія выбываюць за межы Рэспублікі Беларусь для праходжання ваеннай службы ва ўзброеных сілах іншых дзяржаў, ці членамі сем'яў такіх ваеннаслужачых.

Кватэра, заселеная некалькімі наймальнікамі, можа быць прыватызавана адначасова ўсімі наймальнікамі ў агульную долевую ўласнасць.

Прыватызацыя жылых памяшканняў у дамах калгасаў і іншых юрыдычных асоб, заснаваных на правах кааперацыі, праводзіцца па рашэнню вышэйшага органа юрыдычнай асобы.

Дамы (кватэры), якія з'яўляюцца гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, прыватызуюцца пры ўмове падпісання грамадзянамі (удзельнікамі прыватызацыі) ахоўнага абавязацельства, выдадзенага адпаведным органам дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь».

2. Артыкул 7 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«**Артыкул 7**. Для набыцця ва ўласнасць займаемай кватэры ў доме дзяржаўнага або грамадскага жыллёвага фонду наймальнік жылога памяшкання дзяржаўнага (грамадскага) жыллёвага фонду, члены яго сям'і, а таксама іншыя асобы, за якімі ў адпаведнасці з заканадаўствам захоўваецца роўнае з наймальнікам права карыстання гэтым жылым памяшканнем, падаюць заяву ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган ці ў орган кіравання юрыдычнай асобы, у веданні якой знаходзіцца жылое памяшканне. Заява падпісваецца ўсімі асобамі, якія ўдзельнічаюць у прыватызацыі. Рашэнне па заяве павінна быць прынята не пазней чым у двухмесячны тэрмін.

Жылое памяшканне (доля ў такім памяшканні), прыватызаванае сумесна пражываючымі мужам і жонкай, з'яўляецца іх агульнай сумеснай уласнасцю, калі муж і жонка ўдзельнічаюць у прыватызацыі гэтага памяшкання (у тым ліку грашовымі сродкамі, што належаць ім на праве агульнай сумеснай уласнасці). Іншыя члены сям'і, якія ўдзельнічаюць у прыватызацыі жылога памяшкання, маюць права ўласнасці на адпаведную іх удзелу долю ў прыватызаваным жылым памяшканні.

Усе асобы, пералічаныя ў частцы першай гэтага артыкула, маюць роўныя правы на ўдзел у прыватызацыі жылога памяшкання.

Удзел у прыватызацыі жылога памяшкання асоб, якія не валодаюць грамадзянскай дзеяздольнасцю ў поўным аб'ёме, ажыццяўляецца з улікам устаноўленых заканадаўствам асаблівасцей набыцця імі грамадзянскіх правоў і стварэння грамадзянскіх абавязкаў.

Члены сям'і, якія пражываюць у прыватызаваным жылым памяшканні, але не прынялі ўдзелу ў прыватызацыі, захоўваюць права карыстання гэтым памяшканнем. Правы і абавязкі гэтых грамадзян вызначаюцца жыллёвым і іншым заканадаўствам, якое дзейнічае ў адносінах да індывідуальнага жыллёвага фонду».

3. У артыкуле 8 словы «мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў, іх выканаўчымі і распарадчымі органамі» замяніць словамі «мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ў парадку, які вызначаецца мясцовымі Саветамі дэпутатаў».

4. У артыкуле 11:

у частцы першай:

словы «ашчаднага банка» замяніць словамі «Акцыянернага ашчаднага банка «Беларусбанк»;

словы «выканаўчых камітэтаў раённых, гарадскіх, раённых у гарадах Саветаў народных дэпутатаў» замяніць словамі «мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў»;

частку чацвёртую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Частка жылога памяшкання, якая не аплачана за кошт жыллёвай квоты (сумы квот), падлягае выкупу ў цэнах, якія дзейнічаюць на дзень падачы заявы аб прыватызацыі жылля. Пры гэтым жыллёвыя квота (сума квот членаў сям'і, жыллёвыя квоты, падораныя, атрыманыя па спадчыне і набытыя ва ўстаноўленым парадку) залічваецца ў лік пагашэння кошту жылога памяшкання з індэксацыяй, якая ўлічвае змяненне кошту будаўніцтва жылля на момант прыватызацыі ў параўнанні з яго коштам на 31 снежня 1991 года».

5. Артыкул 12 дапоўніць часткамі наступнага зместу:

«Указаныя грамадзяне маюць права на аднаразовае выкарыстанне льготы, прадугледжанай часткай першай гэтага артыкула.

Жылыя памяшканні, якія прыватызуюцца на льготных умовах (з залікам жыллёвай квоты, сумы квот), перадаюцца ўдзельнікам прыватызацыі ў роўных долях.

Тая частка жылых памяшканняў, якая перавышае памер агульнай плошчы, што перадаецца бязвыплатна, прыватызуецца на агульных падставах. Пры гэтым доля ўдзелу ў прыватызацыі грашовымі сродкамі вызначаецца па пагадненню паміж удзельнікамі прыватызацыі».

6. Артыкул 13 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«**Артыкул 13**. Жылыя памяшканні, атрыманыя грамадзянамі ў дамах дзяржаўнага і грамадскага жыллёвага фонду ў выніку зносу жылых дамоў, будынкаў і збудаванняў, што належалі ім на праве ўласнасці, у сувязі з адабраннем зямельных участкаў для дзяржаўных патрэб ці патрэб адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, калі заканадаўствам, якое дзейнічала на момант зносу, не была прадугледжана выплата грашовай кампенсацыі, незалежна ад часу прадастаўлення жылля прыватызуюцца гэтымі грамадзянамі бязвыплатна (без уліку жыллёвай квоты, сумы квот) ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку, а ў выпадку смерці гэтых грамадзян — членамі іх сем'яў, якія атрымалі з імі кватэру і пражываюць у ёй, у тым ліку адсутнымі, што захоўваюць права карыстання дадзенай кватэрай.

Жылыя памяшканні, якія атрымліваюць грамадзяне ў выніку зносу жылых дамоў, будынкаў і збудаванняў, што належаць ім на праве ўласнасці, пасля ўступлення ў сілу гэтага Закона перадаюцца ва ўласнасць грамадзянам, якія з'яўляюцца ўласнікамі (саўласнікамі) зносімых жылых дамоў (частак дамоў).

Члены сям'і, якія не з'яўляюцца ўласнікамі (саўласнікамі) зносімага жылога дома, атрымліваюць жылыя памяшканні па дагавору найму, прыватызацыя якіх праводзіцца на агульных падставах у адпаведнасці з гэтым Законам».

7. Артыкул 14 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«**Артыкул 14.** Кошт аб'ектаў прыватызацыі вызначаецца з улікам іх спажывецкіх якасцей у цэнах, што дзейнічаюць на дзень падачы заявы аб прыватызацыі займаемых памяшканняў, камісіямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, а таксама органамі кіравання юрыдычнай асобы, у веданні якой знаходзіцца жыллёвы фонд, у парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь».

8. У артыкуле 15:

словы «Савету народных дэпутатаў» замяніць словамі «Савету дэпутатаў»;

дапоўніць артыкул часткамі і спасылкай наступнага зместу:

«Прыватызацыя жылых памяшканняў, у якіх пражываюць без паўналетніх членаў сям'і дзеці-сіроты і дзеці*, якія засталіся без апекі бацькоў, ва ўзросце да 15 гадоў, праводзіцца на імя дзяцей па заяве апекуна з папярэдняй згоды органаў апекі і папячыцельства ці па ініцыятыве ўказаных органаў.

Жылыя памяшканні, у якіх пражываюць без паўналетніх членаў сям'і дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, ва ўзросце ад 15 да 18 гадоў, прыватызуюцца на імя дзяцей па іх заяве са згоды папячыцеля і органаў апекі і папячыцельства.

Пры прыватызацыі жылых памяшканняў, указаных у частках першай і другой гэтага артыкула, улічваюцца нявыкарыстаныя жыллёвыя квоты (імянныя прыватызацыйныя чэкі «Жыллё») памёршых (адсутных без вестак) бацькоў (усынавіцеляў).

Дагавор ад імя дзяцей заключаецца ў парадку, прадугледжаным грамадзянскім заканадаўствам.

Пры ўладкаванні дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, у апякунскую (прыёмную) сям'ю, дзіцячы дом, у тым ліку сямейнага тыпу, школу-інтэрнат, іншыя навучальна-выхаваўчыя ўстановы на дзяржаўнае забеспячэнне орган апекі і папячыцельства абавязаны на працягу шасці месяцаў разгледзець пытанне аб магчымасці прыватызацыі на імя дзяцей займаемага выключна імі жылога памяшкання, у выпадку неабходнасці прыняць меры па афармленню прыватызацыі і распараджэнню прыватызаваным жылым памяшканнем у інтарэсах дзяцей.

* У гэтым Законе пад дзецьмі разумеюцца асобы, якія не дасягнулі 18-гадовага ўзросту, калі па заканадаўству яны раней не набылі грамадзянскую дзеяздольнасць у поўным аб'ёме».

9. У артыкуле 16:

абзацы другі і трэці часткі першай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«выплаты паявога ўзносу ў жыллёвым або жыллёва-будаўнічым кааператыве ці пагашэння крэдыту (пазыкі), узятага на гэта будаўніцтва;

фінансавання індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва (рэканструкцыі) індывідуальных жылых дамоў, долевага ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве, пры набыцці жылля шляхам яго куплі, а таксама для пагашэння запазычанасці па крэдытах банкаў і пазыках юрыдычных асоб, узятых і выкарыстаных на ўказаныя мэты»;

частку другую пасля слова «аб'ядноўваць» дапоўніць словам «прадаваць».

10. Артыкул 17 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«**Артыкул 17.** Мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы, прадпрыемствы, арганізацыі могуць выкупляць прыватызаванае жыллё ў грамадзян з іх згоды па дагаворных цэнах».

11. Частку другую артыкула 19 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Пры гэтым паляпшэнне жыллёвых умоў на аснове дагавора найму дзяржаўнага і грамадскага жылля дапускаецца толькі пры ўмове адчужэння ўласнікам займаемага прыватызаванага жылога памяшкання мясцовым Саветам дэпутатаў, юрыдычным асобам, якія прадастаўляюць жыллё, у цэнах, што дзейнічаюць на момант адчужэння, калі ў займаемым памяшканні не застаюцца пражываць члены сям'і ўласніка. Парадак і тэрміны адчужэння займаемага жылога памяшкання ўстанаўліваюцца дагаворам паміж уласнікам і наймадаўцам, які прадастаўляе жыллё. Указаныя ўмовы распаўсюджваюцца на ўдзельніка агульнай долевай уласнасці ў выпадку адмовы ад ажыццяўлення права пераважнай куплі жылога памяшкання іншымі ўдзельнікамі агульнай долевай уласнасці».

12. **Артыкул 21** выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 21. Жыллёвыя квоты (сумы квот) грамадзян і членаў іх сем'яў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў на 1 студзеня 1992 года і набываюць ва ўласнасць жылыя памяшканні ў дамах жыллёвых і жыллёва-будаўнічых кааператываў, а таксама ажыццяўляюць індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва (рэканструкцыю), ці прымаюць долевы ўдзел у жыллёвым будаўніцтве, ці ўступілі ў жыллёвыя, жыллёва-будаўнічыя кааператывы, ці набываюць жылыя памяшканні шляхам куплі, а таксама пры пагашэнні запазычанасці па крэдытах банкаў і пазыках юрыдычных асоб, узятых і выкарыстаных на ўказаныя мэты, падлягаюць індэксацыі з улікам змянення кошту будаўніцтва жылля на дзень звароту гэтых грамадзян з заявай аб індэксацыі жыллёвай квоты ў параўнанні з яго коштам на 31 снежня 1991 года. Пры гэтым індэксацыі падлягаюць жыллёвыя квоты, падораныя, атрыманыя па спадчыне і набытыя ва ўстаноўленым парадку ў грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Індэксацыя жыллёвых квот грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў пасля 1 студзеня 1992 года, праводзіцца ў парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь».

13. Артыкул 24 выключыць.

14. У артыкуле 25 словы «Саветы народных дэпутатаў» замяніць словамі «Саветы дэпутатаў».

15. Артыкул 26 выключыць.

16. Артыкул 30 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«**Артыкул 30**. Сродкі, якія паступаюць ад прыватызацыі жылых памяшканняў, што належаць мясцовым Саветам дэпутатаў і юрыдычным асобам, залічваюцца на спецыяльны рахунак «Прыватызацыя жылля» ў Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь і накіроўваюцца на індэксацыю жыллёвай квоты пры індывідуальным жыллёвым будаўніцтве (рэканструкцыі), пры пагашэнні паявых узносаў у жыллёвых і жыллёва-будаўнічых кааператывах, пры долевым удзеле ў жыллёвым будаўніцтве, пры набыцці жылых памяшканняў і ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

У выпадку недахопу сродкаў на спецыяльным рахунку «Прыватызацыя жылля» абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты выкарыстоўваюць на ўказаныя мэты сродкі мясцовага бюджэту, а пры іх адсутнасці ўказаны рахунак можа папаўняцца з рэспубліканскага бюджэту ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Палажэнне аб рахунку «Прыватызацыя жылля» зацвярджаецца абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі па ўзгадненню з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь. Сумы даходаў, атрыманых ад захоўвання гэтых сродкаў у банку, не абкладаюцца падаткамі і ў поўным аб'ёме залічваюцца на той жа рахунак».

17. Артыкул 31 выключыць.

18. У артыкуле 35:

у частцы трэцяй словы «адпаведна з займаемай імі агульнай плошчай у межах дзеючай кватэрнай платы» замяніць словамі «па фактычных расходах, але не звыш дзеючай кватэрнай платы, устаноўленай заканадаўствам Рэспублікі Беларусь для адпаведнай катэгорыі грамадзян»;

частку трэцюю дапоўніць сказам наступнага зместу: «Заканадаўствам могуць устанаўлівацца іншыя формы арганізацыі кіравання, эксплуатацыі і рамонту жылога дома»;

частку чацвёртую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Адлічэнне сродкаў па капітальны рамонт дома ўласнікамі жылых памяшканняў праводзіцца ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Капітальны рамонт месцаў агульнага карыстання, канструктыўных элементаў, інжынерных сістэм у няпоўнасцю прыватызаваным жылым доме праводзіцца ў адпаведнасці з распрацаванай і зацверджанай ва ўстаноўленым парадку праектна-каштарыснай дакументацыяй».

19. У артыкуле 36 словы «Саветы народных дэпутатаў» замяніць словамі «Саветы дэпутатаў».

20. Дапоўніць Закон раздзелам VI «Заключныя палажэнні» наступнага зместу:

«**Раздзел VI. Заключныя палажэнні**

Артыкул 38. Налічэнне жыллёвай квоты праводзіцца да 1 лістапада 1999 года».

Артыкул 2. Раздзел II Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 1995 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1995 г., № 6, арт. 58) выключыць.

Артыкул 3. Гэты Закон уступае ў сілу з дня яго апублікавання, за выключэннем апошняга абзаца пункта 4, пункта 7 і апошняга сказа часткі першай пункта 12 артыкула 1, якія ўступаюць у сілу з 1 ліпеня 1999 года.

Артыкул 4. Да прывядзення заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам прымяняецца дзеючае заканадаўства Рэспублікі Беларусь у той частцы, у якой яно не супярэчыць дадзенаму Закону, калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін:

унесці ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прапановы па прывядзенню заканадаўчых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам;

прывесці рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам;

забяспечыць перагляд і адмену рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання іх нарматыўных актаў, якія супярэчаць гэтаму Закону.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

5 мая 1998 г., № 139-З

Дарагія суайчыннікі!

15 мая Рэспубліка Беларусь разам з іншымі дзяржавамі адзначае Міжнародны дзень сям'і. Устанаўленне гэтага свята з'яўляецца фактам прызнання асаблівай ролі сям'і, дэманструе імкненне сусветнага грамадства прыцягнуць усеагульную ўвагу да яе праблем.

Стварэнне сям'і — адказная місія, адведзеная чалавеку. З роднымі і блізкімі дзеліць ён радасці і трывогі, поспехі і нягоды. Сям'я для чалавека — крыніца цеплыні, якая дае адчуванне паўнаты жыцця.

Роля сям'і неацэнная. У ёй закладваюцца асновы духоўна-маральнага светаўспрымання, выхоўваецца павага да працы, перадаюцца з пакалення ў пакаленне веды і традыцыі, лепшыя ўзоры жыццёвага вопыту.

Сям'я непарыўна звязана з грамадствам. Моцная сям'я — залог шчаслівай будучыні народа і дзяржавы.

Сёння, калі ў многім мяняюцца каштоўнасці і традыцыі, якія ўжо ўсталяліся, сям'я перажывае нялёгкія часы. Трывогу выклікаюць рост сацыяльнага сіроцтва, праблемы нестабільнасці шлюбаў у рэспубліцы.

У гэтых умовах дзяржава імкнецца забяспечыць спрыяльныя магчымасці для жыццядзейнасці сям'і, удзяляючы першарадную ўвагу пытанням аховы мацярынства і дзяцінства, дапамогі мнагадзетным і няпоўным сем'ям. З мэтай умацавання маральных асноў сям'і, павышэння яе сацыяльнага статусу ў студзені гэтага года ўказам прэзідэнта зацверджаны Асноўныя напрамкі дзяржаўнай сямейнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Выказваю ўпэўненасць, што выкананне прынятай праграмы станоўча адаб'ецца на ўмацаванні сям'і.

Дарагія суграмадзяне! Дабрабыт сям'і ў многім залежыць ад вашай дабрыні і цярпення, спагадлівасці і ўзаемапавагі. Будзьце шчаслівыя ў сваёй сям'і, і няхай цеплыня дамашняга ачага заўсёды саграває вас!

Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

15 мая 1998 года.

Нацыянальныя асацыяцыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў краін былога «сацлагера» — за інтэграцыю

У канцы красавіка ў Браціславе (Славацкая Рэспубліка) правёў сваё чарговае пасяджэнне Савет Міжнароднага кангрэса прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў.

Міжнародны кангрэс прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў створаны ў 1992 годзе, у яго ўваходзяць нацыянальныя грамадскія арганізацыі, якія аб'ядноўваюць прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў у сваіх краінах — рэспубліках былога Саюза і краінах былога СЭУ, а таксама адпаведныя арганізацыі Кітая. На сённяшні дзень у кангрэсе прадстаўлены аб'яднанні прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў з 22 краін, з нашага боку ў яго ўваходзіць Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя. Асноўнымі мэтамі стварэння і дзейнасці кангрэса сталі аднаўленне гаспадарчых сувязяў, падтрымка прамысловай вытворчасці ў нацыянальных эканоміках, вывад з крызіснага стану гандлёва-эканамічных адносін паміж краінамі былога сацлагера. Міжнародны кангрэс прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў пастаянна выказваўся за развіццё эканамічнай інтэграцыі паміж краінамі былога Саюза і былога СЭУ, за ўхіленне неабгрунтаваных перашкод у руху тавараў і капіталаў (што нярэдка робіцца пад сцягам абароны айчынных таваравытворцаў), стварэнне агульнай сучаснай інфраструктуры рынку, наладжванне нармальнага дыялога і ўзаемадзеяння ў сістэме адносінаў «урад—прадпрымальнікі». Старшыня Савета МКПП — Віктар Глухіх, ганаровы старшыня Савета (і яго першы старшыня) — прэзідэнт Расійскага саюза прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў Аркадзь Вольскі.

Каменціруючы вынікі апошняга форуму Савета МКПП, прэзідэнт Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі Міхаіл Лаўрыновіч падкрэсліваў, што многія постсацыялістычныя краіны пры выхадзе на заходнія рынкі сутыкнуліся з немалымі цяжкасцямі, адсюль і заканамерная выснова адносна неабходнасці больш цеснага эканамічнага супрацоўніцтва паміж сабой, якое павінна будавацца выключна на прынцыпах эканамічнай выгады кожнага з бакоў. Пры гэтым М. Лаўрыновіч з жалем зазначаў адносна большай хуткасці, чым у нас, эканамічных пераўтварэнняў і адпаведных сацыяльных змен у іншых постсавецкіх краінах.

У планах МКПП — стварэнне цэнтра прадпрымальніцкіх праектаў і ініцыятыў, падрыхтоўка кодэкса міжнароднага эканамічнага супрацоўніцтва і інш. На пасяджэнні Савета МКПП прыняты рашэнні аб удзеле МКПП у беларуска-расійскў-краінскай асамблеі дзелавых людзей, аб акрэдытацыі пры Міждзяржаўным эканамічным камітэце.

Іван БАРАНОЎСКІ.

«ГЛАДЫЯТАР» «КІК-ФАЙТЭРУ» — НЕ САПЕРНІК

Днямі ў Мінску завяршыўся адкрыты чэмпіянат Беларусі па кікбоксінгу, у якім прынялі ўдзел 8 каманд: 6 — ад кожнай з абласцей, а таксама ад горада Мінска і Расіі, якую прадстаўлялі спартсмены з Цверы. Сярод больш чым 200 кікбаксёраў, якія аспрэчвалі медалі ў чатырох намінацыях (лоў-кік — мужчыны, фул-кантакт — жанчыны, сольныя кампазіцыі — мужчыны і жанчыны) былі такія вядомыя асобы, як Дзмітрый Шакута, Аляксандр Коўцік, Аляксей Пікарчык, Марыя Бусыгіна — чэмпіёны і прызёры сусветных і еўрапейскіх чэмпіянатаў.

Па выніках турніру першае месца заваявалі мінчане. На другой пазіцыі — Віцебская вобласць, на трэцяй — Мінская. І толькі апошняе месца дасталося гасцям.

Сярод клубаў, а ўсяго іх было прадстаўлена 22, пальма першынства ў сталічнага «Кік-файтэра». Следам размясціўся полацкі «Норд», трэцім — «Гладыятар» з Маладзечна.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Старонка Паўла Глобы

15 мая, ПЯТНІЦА

РЭКАМЕНДАЦЫІ. Дзень, прысвечаны маёмасці, грашам і вялікім набыткам. Сёння варта заключаць дагаворы, праводзіць грашовыя аперацыі, рабіць дзелавыя паездкі. Захоўвайце асцярожнасць у абыходжанні з бытавымі прыборамі і транспартнымі сродкамі. Трэба пазбаўляцца ад ілюзій, цвяроза і абдумана ставіцца да паступаючых прапаноў, не ўвязвацца ў авантуры. Увечары добра пабыць аднаму, прачытаць малітвы, пакаяцца, пастарацца сумленна аднесціся да сваіх учынкаў. Карысныя лазні, ачышчэнне арганізма, асабліва скуры.

ПРЫМЕТЫ. Калі вы выйшлі з дому і сустрэлі чалавека з поўнымі сумкамі або вёдрамі, прыміце гэта як знак хуткага паляпшэння дабрабыту. Сустрэць чалавека з пустымі вёдрамі і сумкамі — да цяжкасцяў і выпрабаванняў у бліжэйшы час. Раніцай штосьці падае або губляецца — знак таго, што вы нешта прапусціце ў гэты дзень. У вас парвалася кішэня — знак страты або разарэння. Знайсці пярсцёнак, камень-самацвет — да будучых кампаньёнаў.

СНЫ. Добра ўбачыць многа сноў. Усе сны ў гэты дзень звязаны з маёмасцю. Стрыгчы валасы — знак страт і крадзяжу. Падарожжа або змена дома — да пачатку новай справы. Убачыць гару — да ўдачы. Мыцца, датыкацца да вады — да плётак, падману. Прысніліся манеты — добра, а папяровыя грошы — знак таго, што вашы грошы ператворацца ў пыл.

ЕЖА. Сёння есці можна ўсё, што хочацца, ежа павінна быць разнастайнай і багатай. Лічыцца, што есці можна многа, а піць — мала. Добрыя ўсе малочныя прадукты, а таксама пірагі, пячэнне, бліны з маслам. Віно рэкамендуецца белае, святочнае.

АДЗЕННЕ. Добра апранацца ва ўсё новае. Рэкамендуюцца залацістыя, белыя і чырвоныя колеры. Пазбягайце чорных, сініх і бэзавых колераў. Надзявайце шмат упрыгажэнняў, пярсцёнкаў. Жанчыны павінны быць ва ўсёй прыгажосці, а мужчыны — імі любавацца і радавацца.

МЕДЫЦЫНА. Небяспека пераломаў. Проціпаказана лячэнне зубоў, пазваночніка. Можна рабіць касметычныя аперацыі. Рэкамендуецца чыстка кішэчніка. Для лячэння карысна прымяняць гамеапатычныя сродкі.

Падрыхтавана да друку спецыяльна для «Звязды» астралагічным цэнтрам «АРБА».

* * *

Павел Глоба працягвае чытанне курса лекцый па астралогіі. Чарговая лекцыя адбудзецца ў Цэнтральным Доме афіцэраў 15 мая ў 18.30 у аўдыторыі № 47. Перад пачаткам лекцый будзе прадавацца астралагічная літаратура Паўла Глобы.

Дарагога і любага ***Мікалая Рыгоравіча СІМАЛЬЧУКА*** *віншуем з юбілеем. Жадаем моцнага здароўя, сямейнага шчасця і дабрабыту.*

«Уже полжизни пройдено дорог,
Живи ты в счастье и богатстве,
Хотим, чтоб Бог твой дом берег
и меньше было бы ненастий».

Родныя.

Сардэчна віншуем з 55-годдзем нашу дарагую, любімую ***Марыю Іванаўну КАПЛУН.*** *Жадаем моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, шчасця ў сям'і.*

Муж, дзеці, унукі, в. Тупалы Карэліцкага раёна.

Згублены студэнцкі білет № 510124, выдадзены на імя **Сіняка Яўгена Міхайлавіча,** *лічыць* несапраўдным.

ВІНШАВАННІ

Віншуем дарагую матулю і бабулю ***Аляксандру Сямёнаўну КУЖАЛЬ*** *з в. Забалацце Вілейскага раёна з 60-годдзем. Жадаем здароўя, бадзёрасці, даўгалецця.*

Сын, нявестка, унучка.

Шчыра віншуем з 70-годдзем ***Іосіфа Фёдаравіча ШАВЕЛЯ*** *з в. Буда Лагойскага раёна. Жадаем здароўя, бадзёрага настрою і без прыгод дажыць да 100 год.*

Родныя.

Сардэчна віншуем з 60-годдзем ***Аляксандра Віктаравіча МЕЗЯНА*** *з г. Клічава. Жадаем здароўя, дабрабыту, цяпла ад родных, радасці ад унучак.*

г. п. Рудзенск, **пляменнікі Алена, Галіна, Леанід.**

Віншую любую сястру ***Ірыну Антонаўну КУРЫЛА*** *з г. Смаргоні з днём нараджэння. Жадаю здароўя, шчасця, радасці.*

Сястра, *в. Ліпкі.*

СЁННЯ

СОНЦА

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	6.30	18.09	11.39
Віцебск	6.21	17.58	11.37
Магілёў	6.20	17.58	11.38
Гомель	6.14	17.58	11.44
Гродна	6.43	18.26	11.43
Брэст	6.45	18.25	11.40

МЕСЯЦ

Поўня 11 мая

З 23.05 — 19-ыя месяцавыя суткі. Месяц — у сузор'і Казярога.

ІМЯНІНЫ

ПР. Афанасія, Барыса і Глеба

К. Сафіі, Ізыдора

НАДВОР'Е

Сёння ўдзень па рэспубліцы захаваецца пераменная воблачнасць, па паўднёва-усходняй палавіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ў Гомелі і Магілёве — 10—12, Віцебску — 11—13, Мінску — 12—14, Брэсце — 13—15, Гродне — 14—16 градусаў цяпла.

У наступныя двое сутак: 16-га — месцамі, у асноўным па паўднёваму ўсходу, кароткачасовыя дажджы; 17-га пераважна без ападкаў. Тэмпература ўначы — 3—8, удзень 16-га — 13—18, 17-га — 15—20 градусаў вышэй нуля.

СІТУАЦЫЯ

СМЕРЦЬ СТАРШЫНІ

24 красавіка ўпершыню за час свайго старшынёўства Валерый Волкаў не з'явіўся на калгасны нарад...

Яго знайшлі за 20 кіламетраў ад Сталовіч, на возеры Кутаўшчына. Старшыня баранавіцкага калгаса «Новы шлях» кінуўся ў ваду проста з дамбы. Непадалёку стаяла машына з рацыяй, па якой марна выклікалі кіраўніка гаспадаркі з дыспетчарскай, чакалі яго і ў райцэнтры. Перадсмяротнай запіскі ў машыне не знайшлі...

Гібель старшыні калгаса трапіла ў разрад надзвычайных здарэнняў у Баранавіцкім раёне, яна моцна ўзрушыла яго калег і калгаснікаў з «Новага шляху» і стала сапраўднай трагедыяй для сям'і нябожчыка: В. Волкаў пакінуў удавой жонку і дваіх малалетніх дзетак, 3 і 5 гадоў, — сіротамі. Адчайная, але непатрэбная, невытлумачальная смерць, у якую проста не хочацца верыць.

Расказвае жонка нябожчыка Інеса Андрэеўна Волкава:

— 24 красавіка мы ўсталі, як заўсёды, у шэсць гадзін раніцы, пайшлі папрацаваць на агародзе. Валерый быў крыху засмучаны, ён паскардзіўся на свае праблемы, сказаў, што механізатары дрэнна засеялі адно поле, і таму зноў будзе наганяй ад раённага начальства. Ён ужо цэлы тыдзень такі хадзіў. Потым ён апрануўся і пайшоў на планёрку. Я яшчэ папрацавала, пасля адвяла дзяцей у садзік. А ў палове дзесятай пазванілі з канторы і запыталі, дзе Валерый Анатольевіч, чаму не быў на нарадзе... Тут мяне быццам халоднай вадой аблілі.

— Тое, што Волкаў пакончыў жыццё самагубствам, не выклікае сумнення,— адзначае намеснік пракурора Баранавіцкага раёна Генадзь Кулак.— Пра гэта сведчаць медэкспертыза і паводзіны загінуўшага ў дзень смерці. А вось наконт прычыны, якая падштурхнула да такога кроку, — то зразумела, што яна ў падобных выпадках заўсёды ёсць, але на гэты раз яе трэба шукаць у сферы маралі...

Вядома, пракуроры могуць узбудзіць крымінальную справу, маральныя ж ацэнкі яны даваць не могуць — не існуе такога паняцця, як «маральная справа»... Хаця людзі вельмі часта выносяць і маральныя прысуды. Многія вяскоўцы са Сталовіч, ацэньваючы сітуацыю, гаварылі: «Волкава з'елі, загналі ў магілу». На хаўтурах В. Волкава ў калгасным клубе вяскоўцы ў эмацыянальным парыве выказвалі абвінавачанні ў адрас старшыні райвыканкама Міхаіла Гулюка і раённага кіраўніцтва ў цэлым. А маці Валерыя Анатольевіча загаласіла: «Чым жа ты, сынок, не дагадзіў начальству?»

Валерыя Волкава абралі на пасаду кіраўніка калгаса «Новы шлях» зусім нядаўна, 14 лістапада мінулага года. Прычым абралі ў прамым сэнсе: на бурным сходзе калгаснікі большасцю галасоў адхілілі кандыдатуру з суседняй гаспадаркі, якую прапаноўваў райвыканкам, і прагаласавалі за свайго чалавека, галоўнага эканаміста Валерыя Волкава, які не ўваходзіў у кадравы рэестр раённай улады. Навучаныя новым вопытам, калгаснікі патрабавалі: «Нам трэба, каб старшынёй быў свой чалавек, каб мы яго ведалі, каб жыў з намі, а не штовечар ад'язджаў з калгаса. Чужы адразу ж пачне сабе катэдж будаваць».

І ў цэлым калгаснікі заставаліся задаволеныя сваім выбарам. Галоўны інжынер калгаса М. Качан адзначаў, што Волкаў працаваў «ад цямна да цямна і многае зрабіў бы»; сярэдняя зарплата пры ім вырасла на мільён рублёў, гаварыла галоўны бухгалтар Г. Лешчанка. Пры ім пачалі адраджаць раней занядбаныя грыбны і каўбасны цэхі, фірменны магазін, павялічылі плошчы пасеваў даволі рэнтабельных цукровых буракоў...

— Ён быў энергічны, яму адразу хацелася ў некалькіх месяцах пабываць,— гаворыць удава Волкава Інеса Андрэеўна. — Ён стараўся, як мог, імкнуўся нешта зрабіць у гэтых складаных умовах, калі на калгасе «вісіць» запазычанасць каля 4 мільярдаў, калі няма вольных грошай, а трэба плаціць за энергію, запчасткі, калі ўсё псуецца і ламаецца ... Але ў яго не склаліся адносіны з кіраўніцтвам раёна. Ён неяк сказаў мне: «Стараюся-стараюся, а мне ўсё «ўтык» ды «ўтык» — і ўсё з-за таго, што начальству непажаданы»... Калі б яны былі зацікаўленыя ў тым, каб Волкаў працаваў нармальна, дык падтрымалі б, пакалі, як трэба, а так — наганяі ды штрафы, шматлікія рэвізіі і праверкі... Пасля каталіцкага Вялікадня Волкава як падмянілі, на яго нейкае ананімнае пісьмо прыйшло, аб чым яму паведаміў старшыня райвыканкама М. Гулюк, пачалі разбірацца. Яму далі пачытаць гэтае пісьмо, там яго абвінавачвалі, што ён жывёлу разбазарвае, бо абмяняў па бартэру яе на дызпаліва, а так у нас і раней рабілі, бо трэба ж сеяць; што абмяняў цукар на хамуты, што жонку возіць на базар прадаваць малако на калгаснай машыне, хаця ў нас карова ў запуску была... За гэтае пісьмо ўхапілася кантрольна-рэвізійная камісія, пачалася праверка за праверкай па ўсіх галінах гаспадаркі... Я не ведаю, хто вінаваты ў яго смерці, губляюся ў здагадках. На пахаванні аб ім добрыя словы казалі, а каб хоць частку гэтых слоў сказалі пры жыцці, то ён і цяпер бы жыў. Калі б ён адчуваў падтрымку, а то за кожнае ўпушчэнне яго «прызямлялі».

— Ведаеце, ён быў малады кіраўнік, толькі пачынаў працаваць, і ў яго не ўсё атрымлівалася, — гаворыць намеснік старшыні Баранавіцкага райвыканкама, начальнік райсельгасхарча Уладзімір Бернат.— Я мяркую, што Волкаў сябе пераацаніў, думаючы, што ён ужо на ўсе пасады гатовы. А потым, калі сутыкнуўся з чарнавой руціннай працай у гаспадарцы,— разгубіўся. Як эканаміст ён быў моцны, а вось як тэхнолаг — слабы. А трэба было браць у рукі арганізацыю вытворчасці. Таму ўвесь час былі збоі, то на ферме, то ў полі, напэўна, гэта на яго падзейнічала. Мы ж яму падказвалі, там нашы спецыялісты пастаянна працавалі, я сам там часта бываў. Калі ж яго крытыкавалі, дык ён адразу ўступаў у палеміку. Як старшыні яму яшчэ трэба было б папрацаваць. Ніякіх прадузятых адносінаў да Волкава не было, сёння патрабаванні да ўсіх аднолькавыя, а да маладых дык і больш ашчадныя. Іншая справа, як успрымае крытыку кіраўнік, калі яму даводзіцца адказваць за ўсю гаспадарку. Волкаў жа не быў падрыхтаваны да гэтай пасады ні псіхалагічна, ні як спецыяліст.

Таксама досыць крытычна ацаніў працу Волкава і старшыня Баранавіцкага райвыканкама Міхаіл Гулюк. Ён, у прыватнасці, зазначыў, што Волкаў не ўмеў кіраваць калгасам, што ад яго сышлі некалькі маладых спецыялістаў, што ён быў некампетэнтны ў многіх пытаннях сельскай гаспадаркі... М. Гулюк лічыць, што трагічнае здарэнне з В. Волкавым адбылося па асабістых, не звязаных з працай матывах, і мяркуе, што ён як кіраўнік раёна не быў прадузятым у адносінах да маладога старшыні і таму не лічыць сябе ў чымсьці вінаватым у гэтай трагедыі.

Аднак іншыя старшыні гаспадарак Баранавіцкага раёна, калегі Валерыя Волкава, з якімі ўдалося паразмаўляць, былі не настолькі крытычныя і жорсткія да Валерыя Волкава і часам здзіўляліся празмернай прылюднай крытыцы ў яго адрас з боку раённага начальства.

— Волкаў імкнуўся і стараўся, гэта бачна было. Папрацаваў жа ён надзвычай мала. А каб атрымаўся сапраўдны кіраўнік, трэба даць яму на гэта як мінімум тры гады: першы год ён будзе, як той сляпы, рабіць памылкі, другі — пачне выпраўляць іх, на трэці ж пачне набіраць сілы. Прычым у цяперашняй абстаноўцы адаптавацца не так лёгка. Тэхніка канчаткова зношваецца, грошай і рэсурсаў не хапае. Затое правяраючых больш, чым працуючых. Якая тут самастойнасць і рынак, гэта ж дзікі рынак, усё трымаецца ў жорсткім кулаку. Патрабаваць, канешне, трэба, але пытанне ў тым, як. У нас жа нават без дазволу з раённага цэнтра старшыня калгаса за межы гаспадаркі выехаць не можа. Такі стыль кіраўніцтва, які існуе цяпер у Баранавіцкім раёне, непрымальны. Так кіраваць нельга,— вось што сказаў з гэтай нагоды заслужаны старшыня іншага калгаса ў Баранавіцкім раёне, які не першы дзесятак гадоў паспяхова кіруе сваёй гаспадаркай. Аднак ён папрасіў не называць у газеце сваё імя. І гэта таксама гаворыць аб сітуацыі ў раёне. Прыкладаў грубага абыходжання, нервовых разборак і некарэктнай прылюднай крытыкі ўдалося зафіксаваць нямала. Хтосьці ўспрымае ўсё гэта спакойна ці абыякава, а камусьці і вельмі балюча... І, відаць, Баранавіцкі раён тут зусім не ўяўляе сабой выключэнне.

...Як паведаміў старшыня Баранавіцкага райвыканкама М. Гулюк, у раёне пачакаюць 40 дзён пасля смерці Волкава, а пасля прывязуць на сход у калгас «Новы шлях» новую кандыдатуру з раённага кадравага рэестра. Механізатары ж і інжынеры на мехдвары ў самім «Новым шляху» зазначылі, што больш сваіх кандыдатаў на гэтае нешчаслівае месца яны вылучаць не будуць. Першы іх вопыт калгаснай дэмакратыі аказаўся няўдалым.

Валер КАЛІНОЎСКІ,
Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Баранавіцкі раён.

ЮБІЛЕІ

Уладзімір ДАНЬКО:

«Змагацца з прафесійнай злачыннасцю могуць толькі прафесіяналы»

